Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА № 13 (28377)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



На выхадных — снег і дождж

СТАР. 3



Выбіраем нашу зорку «Еўрабачання»

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ГАЕЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці:**

*«Па выніках учарашняй нарады кіраўнік дзяржавы даў шэраг даручэнняў па ўдасканаленні зямельнага заканадаўства. У прыватнасці, пастаўлена задача рацыяналізаваць парадак работы з пустымі і старымі дамамі. Ён будзе распаўсюджаны не толькі на сельскія населеныя пункты, але і на гарады. У ім будуць спрошчаны пытанні, звязаныя з уцягваннем у абарот і зносам старых аб'ектаў. Гэтыя і іншыя карэкціроўкі ўнясуць, і праект указа будзе дапрацаваны ў найбліжэйшы час».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9472 | ▲ |
| Еўра | 2,0719 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Цяпло хрышчэнскай вады



Фота БЕЛТА.

Учора па ўсёй краіне праваслаўныя вернікі святкавалі Вадохрышча — Хрышчэнне Гасподняе. Лічыцца, што ў гэты дзень усе вадаёмы набываюць гаючую сілу, тым больш, калі гэта вытокі, якія і ў іншыя дні лічацца святымі, як, напрыклад, славутая Блакітная крыніца ў Слаўгарадскім раёне. Сюды ўчора з'ехаліся сотні прыхаджан не толькі з Беларусі. З малітвай і верай людзі бясстрашна акуналіся ў вадохрышчанскую «купель». Маркуючы па твары Алены ЗІНКЕВІЧ, у ёй было зусім не холадна.

СТАР. 3

## Свая справа

# ГРОШЫ НА КВЕТКАХ І ПРЫЧОСКАХ

### Які бізнес лепш адкрыць у сельскай мясцовасці?

**Знайсці работу ў вёсцы складаней, чым у горадзе. Месцаў прадаўцоў і кіроўцаў (менавіта яны карыстаюцца найбольшым попытам у саіскальнікаў у сельскай мясцовасці) на ўсіх ахвотных не хопіць, а нешматлікія адкрытыя вакансіі патрабуюць спецыяльнай адукацыі. Адзін са спосабаў забяспечыць сябе жаданай прафесіяй і прыстойным заробкам — адкрыць сваю справу. Якая дзейнасць можа стаць прыбытковай? Разбіраемся ў гэтым разам з вясковымі прадпрымальнікамі і экспертам.**

СТАР. 4



Фота БЕЛТА.

## Камунальныя стасункі

# Крыніца антысанітарыі ці прыкмета камфорту?

### Мінчане «за» і «супраць» заварвання смеццеправодаў

**Аб неабходнасці прыбраць прыладу, асаблівы шум якой знаёмы практычна кожнаму жыхару шматпавярхоўкі, гавораць ужо не адзін год. Аднак цяпер у спрэчным пытанні з'явіўся яшчэ адзін момант: для тых, хто адмовіцца ад смеццеправода, вываз цвёрдых адходаў будзе каштаваць танней. Мы даведаліся ў мінчан, ці гатовыя яны «развітацца» з гэтай выгодай (ці ўсё ж такі ліхам?) цывілізацыі і як яны ставяцца да сартавання смецця.**

Першыя смеццеправоды з'явіліся ў сталіцы ў 1950-х гадах: ідэю падгледзелі ў Мексіцы. Шчаслівымі карыстальнікамі навінкі сталі і без таго аблашчаныя лёсам жыхары рэдкіх у той час дамоў, дзе было больш за 5 паверхаў. Але калі тады ў «вынаходцы» бачылі адны плюсы, то цяпер знаходзяць пераважна адмоўныя бакі.

Часцей за ўсё смеццеправод выглядае так, што, акрамя як у гаспадарчых пальчатках, дакранацца да яго не хочацца. А ў некаторых выпадках не перашкодзіў бы яшчэ і рэспіратар. Неакуратнае выкарыстанне або забіванне смеццеправода з'яўляецца адной з класічных прычын сварак паміж суседзямі. Вось адзін з довадаў, па якіх ад прылады ўсё ж варта адмовіцца. Ніякай антысанітарыі і непрыемнага паху ў пад'ездзе, ды і суседскія адносіны больш спакойныя, бо хоць бы ў гэтым «брудным» пытанні кожны адказвае толькі сам за сябе.

Іншы, больш глабальны аргумент — гэта тое, што адмова ад смеццеправода спрыяе распаўсюджванню тэндэнцыі раздзельнага збору смецця. Пра неабходнасць ратаваць планету ад саміх сябе апошняе дзесяцігоддзе мы чуем ледзь не кожны дзень. Але многім усё яшчэ здаецца, што заклікі звернутыя да нейкіх абстрактных гіганцкіх карпарацый, а зусім не да простых людзей. Тым не менш ролю кожнага асобна ўзятага чалавека нельга недаацэньваць. Аналогію можна правесці з прымаўкай «з міру па нітцы — голаму кашуля».

І людзей, якія гэта ўсведамляюць, у Беларусі становіцца ўсё больш і больш.

СТАР. 4

# ЗЯМЛЯ — АСНОВА ЎСЁЙ АЙЧЫНЕ

## Прэзідэнт паставіў задачу ўдасканаліць заканадаўства аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў

**Такое даручэнне кіраўнік дзяржавы даў на нарадзе па гэтай праблематыцы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што належнае выкарыстанне зямельных участкаў — гэта найважнейшае пытанне, якому ён надае сур'ёзную ўвагу.**

«Наша задача — падыходзіць да ўсіх змен узважана. Я не кажу, што немагчыма карэктаваць нейкія нормы заканадаўства: і дэкрэты, і ўказы Прэзідэнта, і законы падлягаюць карэкціроўцы, паколькі жыццё ідзе, усё мяняецца. Але я хацеў бы ведаць прычыну і якія змены адбыліся, што мы зноў бяромся за гэты дакумент, — сказаў Прэзідэнт. — Передача зямлі павінна прыносіць дзяржаве эканамічную выгаду. Пры гэтым трэба выключыць лішнія адміністрацыйныя бар'еры і празмерную бюракратыю».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі існавалі розныя падыходы да рэгулявання зямельнага заканадаўства: спачатку гэтыя пытанні жорстка кантраляваліся, а затым губернатарам была дадзена магчымасць прымаць рашэнні на месцах, прадастаўляючы зямлю інвестарам. Аднак гэтае паслабленне прывяло да неналежнага выканання заканадаўства і, як вынік, занядбанасці тэрыторый. «Таму я быў вымушаны адмовіцца ад практыкі прадастаўлення зямельных участкаў губернатарамі і вярнуць гэта права Прэзідэнту. Яшчэ раз падкрэсліваю: хто-хто, а губернатары ведаюць маё стаўленне да зямлі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта багацце краіны. Губіць яго нікому не дазволена, таму што яно не нам належыць і нават не нашым дзецям. Яно належыць будучым пакаленням».

Прэзідэнт пацікавіўся, ці накіраваны абмяркоўваемы на нарадзе праект дакумента, які прадугледжвае карэкціроўку ўказа «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў», на рашэнне задач па забеспячэнні захаванасці зямельных рэсурсаў як нацыянальнага здабытку дзяржавы. «Ці спросціць ён працэдуры прадастаўлення зямельных участкаў і змены іх мэтавага прызначэння? Ці не створыць усе прапанаваныя карэкціроўкі магчымасці для махінацый з зямлёй? Улічваючы звароты грамадзян, звязаныя з адабраннем зямельных участкаў для дзяржаўных патрэб, хачу даведацца, наколькі меры, што прымаюцца, паслужаць вырашэнню ўзнікшых сітуацый, — сказаў беларускі лідар. — У цяперашні час востра стаіць пытанне аб уключэнні ў гаспадарчы абарот зямельных участкаў, занятых інвестарамі, якія не выконваюць свае абавязацельствы. Асабліва ў Мінскай вобласці. Неабходна навесці парадак з такімі інвестарамі».

На нарадзе было адзначана, што з пачатку 2017 года дзейнічае новы Лясны кодэкс, які змяніў падыходы да арганізацыі ляснай гаспадаркі. Прэзідэнт даручыў далажыць, як улічаны ў праекце ўказа палажэнні гэтага дакумента, якім чынам цяпер будуць прадастаўляцца землі, што раней адносіліся да лясоў першай і другой групы, і ці праводзяцца мерапрыемствы па распрацоўцы новых лесаўпарадкавальных праектаў.

Асобна кіраўнік дзяржавы пацікавіўся мерамі па высечцы дрэў паблізу ліній электраперадачы, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Паводле яго слоў, суцэльная высечка або паўтор леташняй сітуацыі, калі ў выніку вала без электрычнасці засталіся многія населеныя пункты, недапушчальныя. «Мне ўжо прынеслі дакумент — уздоўж кальцавой дарогі трэба высечы 220 дрэў. Чым яны перашкаджаюць лініі электраперадачы? Колькі дрэў да гэтага часу ўпала на гэтую лінію электраперадачы? Хацеў бы пачуць тлумачэнні падобных прапаноў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я хачу, каб вы былі гаспадарамі на сваёй зямлі і ставіліся да дрэў, якія вырасцілі дзякуючы Богу, як да вамі пасаджаных».

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй Гаеў далажыў, што праектам указа прапануецца, не змяняючы канцэптуальна існуючыя падыходы да адабрання і выдзялення зямельных участкаў, спрасціць гэтыя працэдуры, прадугледзець механізмы абароны правоў землекарыстальнікаў, а таксама ўзмацніць адказнасць за рашэнні, што прымаюцца па зямельных пытаннях.

Па выніках нарады Прэзідэнт даў шэраг даручэнняў па ўдасканаленні заканадаўства. У прыватнасці, гаворка ішла пра неабходнасць рацыяналізаваць парадак работы з пустымі і старымі дамамі.

# ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ ШЧЫРАЙ ДРУЖБЫ

**25 гадоў назад, 20 студзеня 1992 года, былі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай.**

У гэтым жа годзе ў Мінску было адкрыта Пасольства КНР, а з 1993 года беларускія дыпламаты сталі працаваць у Пекіне. Развіццё адносін з Кітаем — прыярытэтны кірунак знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Бакі рэгулярна абменьваюцца візітамі на вышэйшым і высокім узроўнях, ажыццяўляецца актыўны міжпарламенцкі дыялог, дынамічна развіваюцца міжведамасныя беларуска-кітайскія кантакты. На сённяшні дзень Кітай — адзін з найважнейшых стратэгічных партнёраў нашай краіны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Старшыню КНР Сі Цзіньпіна і ўвесь дружалюбны народ Кітая з 25-й гадавінай устанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «За чвэрць стагоддзя пройдзены значны шлях у станаўленні і развіцці беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння, заснаванага на прынцыпах роўнасці і павагі інтарэсаў адзін аднаго, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы ганарымся, што ў Беларусі і Кітая склаліся сапраўды саюзніцкія адносіны. Дасягнуты беспрэцэдэнтна высокі ўзровень давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва».

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што дыялог паміж Беларуссю і КНР будзе і надалей паглыбляцца і ахопліваць усё новыя сферы. «Вялікія перспектывы мы бачым ва ўзмацненні інвестыцыйнага складніка, актывізацыі прамых сувязяў паміж рэгіёнамі. Беларусь будзе і надалей прыкладаць усе намаганні па эфектыўнай рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях», будаўніцтве Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» як апорнай кропкі і «жамчужыны» Эканамічнага пояса Шаўковага шляху», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт перакананы, што юбілейны год адзначыцца плённым развіццём двухбаковых адносін, інтэнсіўным культурным абменам, новымі кантактамі, ідэямі і кірункамі ўзаемадзеяння.

Старшыня КНР Сі Цзіньпін таксама ад імя кітайскага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта нашай краіны і беларускі народ з 25-годдзем устанаўлення беларуска-кітайскіх дыпламатычных адносін.

У віншаванні гаворыцца, што ў цяперашні час кітайска-беларускія адносіны характарызуюцца ўстойлівым развіццём, узровень двухбаковага супрацоўніцтва бесперапынна павышаецца. «Палітычны ўзаемадавер з'яўляецца трывалым, мы аказваем адзін аднаму цвёрдую падтрымку па важных пытаннях, што тычацца інтарэсаў нашых краін, — адзначыў Старшыня КНР. — На фоне сумеснага будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» прагматычнае супрацоўніцтва ў розных галінах з'яўляецца прадуктыўным. Абодва бакі падтрымліваюць шчыльныя кантакты і ўзаемадзеянне па міжнародных пытаннях».

Сі Цзіньпін лічыць, што кітайска-беларускія адносіны служаць узорам міждзяржаўных адносін і выконваюць важную ролю ў садзейнічанні рэгіянальнай і міжнароднай стабільнасці і міру.

■ Парламенцкі дзённік

# СТЫПЕНДЫІ ДЛЯ ГУЛЬЦОЎ ЗБОРНЫХ КАМАНД

**Змяненні ў Закон «Аб фізічнай культуры і спорце» абмеркавалі ў Палаце прадстаўнікоў.**

Іх дастаткова шмат, і закранаюць яны самыя розныя аспекты сферы. Ухора на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы абмяркоўвалі, як можна зрабіць фізкультуру больш папулярнай сярод розных слаёў насельніцтва і што ў айчынным спорце трэба ўдасканаліць.

Што плануецца змяніць у законе? Паперашае, тэрміналогію.

— Мы шмат кажам пра тое, што ў нас ёсць заўзятары, страхавыя агенты, але такіх прававых статусаў на заканадаўчым узроўні няма, — звяртае ўвагу **Ігар НЕВАР, член названай Пастаяннай камісіі.** — Зараз гэтыя тэрміны ўносяцца як афіцыйна прызнаныя. Акрамя таго, упершыню ў нас уводзіцца тэрмін «сцюард».

Вялікае значэнне мае тэхніка бяспекі і ўвогуле тэхніка правядзення спартыўных, спартыўна-масавых спаборніцтваў. Для гэтага ўводзіцца больш жорсткі рэжым пропуску на стадыёны. Напрыклад, на стадыёны забараняецца прыносіць рэчы, якія па сваіх параметрах перавышаюць дапушчальныя 40х40х45 сантыметраў, калі гэта не ўзгоднена з арганізатарамі мерапрыемстваў. Акрамя гэтага, забараняецца прыносіць іншыя прадметы, якія прызнаныя небяспечнымі — петарды, напрыклад.

Некаторыя навацыі законапраекта датычацца гатоўнасці будынкаў, збудаванняў і прыстасаванняў для правядзення спартыўных мерапрыемстваў.

Ёсць асобны артыкул, скіраваны на масавую папулярызацыю здаровага ладу жыцця і развіцця спаборніцкіх рухаў.

Яшчэ адна змена ў законе: даецца права мясцовым органам улады з мясцовых бюджэтаў стымуляваць і матываваць спартсменаў зборных каманд, выплачваць ім стыпендыі.

— Раней гэтага не было. Тут мы разглядаем дваякае гэтае пытанне: ці гэта будзе рэспубліканскі фонд, ці мясцовы. Але гаворка ідзе пра рэспубліканскія і зборныя каманды па розных відах спорту.

У вышэйназваным законапраекце наша краіна карэктуе сваё заканадаўства з улікам новай версіі Сусветнага антыдопінгавага кодэкса. Там, у прыватнасці, прадугледжана забарона на супрацоўніцтва спартсменаў і іншых асоб, якія маюць прамыя прафесійныя адносіны да спорту, з персаналам спартсмена, абвінавачанага ў парушэнні антыдопінгавых правілаў або ў якіх-небудзь іншых дзеяннях, звязаных з выкарыстаннем допінгу. Як падкрэсліў **намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр ДУБКОЎСКІ,** дзяржава мае намер строга прытрымлівацца гэтай і іншых нормаў кодэкса.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# КОЛЬКАСЦЬ ЯКАСЦІ НЕ ПЕРАШКОДА

## Форум рэгіёнаў павысіць каэфіцыент карыснага дзеяння

**У чацвёртым Форуме рэгіёнаў будзе яшчэ больш удзельнікаў, чым у мінулыя гады. Пра гэта паведаміла Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас першага пасяджэння аргкамітэта форуму, што адбылося ўчора ў Маскве.**

«Кіраўнікі нашых дзяржаў Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін неадназова падкрэслівалі, што вялікую вагу для супрацоўніцтва дзвюх краін маюць агульныя пытанні, якія датычацца жыцця людзей, інтэграцыі рэгіёнаў, развіцця адносін як на ўзроўні прадпрыемстваў, так і на ўзроўні выканаўчай улады і органаў самакіравання, — заявіла віцэ-спікер. — Таму Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі — гэта асаблівая пляцоўка, якая дае магчымасць інтэграцыі ў высокай ступені».

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыла, што на форуме будуць падведзены вынікі сумеснай беларуска-расійскай работы па тэматыцы гэтага мерапрыемства — высокія тэхналогіі, інавацыі, інфармацыйнае грамадства. У сувязі з гэтым яна прапанавала максімальна задзейнічаць моладзь пры падрыхтоўцы форуму. Марыяна Шчоткіна запэўніла, што будзе прыкладзены максімум намаганняў, каб павысіць каэфіцыент карыснага дзеяння форуму. Чацвёрты Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі пройдзе ў Маскве 29—30 чэрвеня.

**Веранiка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ За падзеяй

# Людзі культуры — зоркі Гродзеншчыны

## Сталі вядомыя імёны лаўрэатаў прэміі імя Аляксандра Дубко Гродзенскага аблвыканкама «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва»

Гэтая ўзнагарода вось ужо 19-ы раз штогод прысуджаецца з мэтай падтрымкі творчай ініцыятывы і інтэлектуальнага патэнцыялу, а таксама за асабісты ўклад у развіццё культуры і мастацтва, прапаганду нацыянальных традыцый, высокае прафесійнае майстэрства.

— 2016-ы, Год культуры, мы ўсе імкнуліся правесці нестандартна, прыўнесці нешта новае, таму і лаўрэаты выбіраліся з асаблівай дбайнасцю. Думаю, ім таксама асабліва прыемна атрымаць прэмію па выніках Года культуры, — адзначыў падчас цырымоніі, што прайшла ў малой зале Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.** — Увага да творчых людзей невыпадковая. Яны павышаюць духоўнасць, маральнасць грамадства, нясуць пазітыў. Людзі культуры ўслаўляюць свой горад, рэгіён, краіну.

Так, сярод лаўрэатаў прэміі — Вера Белакоз, народны майстар Беларусі з вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна. Яна ўзнагароджаная за асабісты ўклад у адраджэнне, захаванне і развіццё тэхналогіі падвойнага ткацтва як элемента нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. Таксама лаўрэатам стаў загадчык аддзела навейшай гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Андрэй Вашкевіч: ён аўтар навуковай канцэпцыі музея Аўгустоўскага канала, які быў адкрыты ў 2016 годзе. Высокая ўзнагарода ўручана мастацкаму кіраўніку заслужанага аматарскага калектыву «Гродзенскі званочак» Таццяне Стрыжак — у 2015—2016 гадах дзіцячы тэатр з Гродна перамог у некалькіх міжнародных конкурсах.

Лаўрэатамі прэміі сталі і акцёр Гродзенскага абласнога тэатра Васіль Мініч, галоўны рэжысёр XI Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур Вольга Багдановіч, галоўны мастак Гродзенскага абласнога тэатра лялек Ларыса Мікіна-Прабадзяк, пісьменніца Святлана Кошур, журналістка Ганна Вашкевіч, выкладчыца Шчучынскай дзіцячай школы мастацтваў Святлана Бярозкіна, музыкант Алег Целяпнёў, мастацкі кіраўнік народнага ансамбля народнай песні «Ярыца» з Мастоўскага раёна Шаміль Тайроў, загадчыца сектара культуры і вольнага часу ў аграгарадку Грынкі Свіслацкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Марыя Самалевіч, загадчыца аддзела Навагрудскай раённай бібліятэкі Іна Шаўчук, выкладчык па класе саксафона Гродзенскага каледжа мастацтваў Сяргей Санец ■

## НА ПРАМОЙ ЛІНІІ — УЛАДА

**У гэтую суботу па традыцыі, якая даўно ўжо склалася, на прамую лінію з жыхарамі краіны выйдуць прадстаўнікі кіраўніцтва рэгіёнаў. Усе грамадзяне, якія маюць пытанне па той ці іншай праблеме, могуць патэлефанаваць і атрымаць адказ з першых вуснаў.**

**Брэсцкі аблвыканкам**
ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч, намеснік старшыні: (8-0162)21-31-21
**Віцебскі аблвыканкам**
СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч, кіраўнік спраў: (8-0212)22-22-22
**Гомельскі аблвыканкам**
КАНЮШКА Андрэй Васілевіч, намеснік старшыні: (8-0232)75-12-37
**Гродзенскі аблвыканкам**
КРАЎЦОЎ Уладзімір Васілевіч, старшыня: (8-0152)73-56-44
**Магілёўскі аблвыканкам**
НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч, намеснік старшыні: (8-0222)50-18-69
**Мінскі аблвыканкам**
ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч, старшыня Савета дэпутатаў: (8-017) 500-41-60
**Мінскі гарвыканкам**
ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч, старшыня: (8-017)222-44-44

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку міністра інфармацыі Рабаволаву Уладзіміру Анатолевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне намесніку міністра інфармацыі Рабаволаву Уладзіміру Анатолевічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю МАЦІ.**

# Вадохрышча на Блакітнай крыніцы





Фота Уладзіміра РЫЖАНКОВА.

**Галоўная каштоўнасць Слаўгарадскага раёна, да якой ад райцэнтра крыху больш за 10 кіламетраў, зімой становіцца амаль недаступнай. Рака Сож, за якой яна знаходзіцца, замярзае, і трэба ехаць больш за 100 кіламетраў цераз Чэрыкаў і Краснаполле, каб дабрацца да яе. Але гэта не перашкодзіла Слаўгарадскаму райвыканкаму сумесна з мясцовымі дэпутатамі і фондам развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра» арганізаваць тут прыгожае свята са спевамі ў выкананні артыстаў раённага Дома культуры і выставамі-продажамі сувенірнай прадукцыі ад мясцовых рамеснікаў.**

Сваю прадукцыю прапаноўвалі таксама слаўгарадская райспажыўкааперацыя і тутэйшыя майстры-сыраробы. Перад тым, як пачаць галоўны абрад Вадохрышча, ваду асвяціў настаяцель храма-помніка ў гонар Святых Пятра і Паўла ў Лясной Георгій Сакалоў. Але ахвотных акунуцца ў студзеньскую ваду, тэмпература якой тут, дарэчы, не мяняецца ні зімой, ні летам і застаецца адносна высокай — каля 10 градусаў, было не шмат. Нават з умовай, што яны маглі скарыстацца мабільнай лазняй і паслугамі аднаго з вядомых беларускіх парыльшчыкаў Генадзя Мароза. Затое асвячоную ваду народ цягаў бітонамі. Госці з Украіны, напрыклад, прыхапілі цэлых пяць важкіх ёмістасцяў. Вада ў Блакітнай крыніцы, вядомая рэч, выдатная. Але, як кажуць святары, нават бутэлечкі хопіць, каб потым па кроплі асвячаць ёй усю астатнюю ваду на працягу года. Да таго ж на Вадохрышча нават вада з-пад крана набывае асаблівую моц.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ПРЫСЯГНУЛІ НА ВЕРНАСЦЬ

**Добрая традыцыя прымаць прысягу ў дзень Вадохрышча стала знамянальнай яшчэ для 38 ратавальнікаў Магілёўшчыны. Усе яны ўжо служаць, і прысяга стала для іх дадатковым стымулам для добрага выканання сваіх абавязкаў. Урачыстая падзея адбылася ў адным са знакавых месцаў Магілёва — на плошчы Славы каля Вечнага агню.**

— Шлях герояў да славы заўсёды пачынаўся з прынясення прысягі, яны ніколі ёй не здраджвалі і заслугоўваюць захаплення. Трэба раўняцца на іх. Сёння кожны з вас даў абяцанне служыць шчыра і мужна. Несумненна бацькі ганарацца выбарам сваіх дзяцей. Спадзяёмся, што іх пажаданні таксама будуць садзейнічаць прафесійнаму станаўленню іх сыноў і добрасумленнаму выкананню імі службовага абавязку, — звярнуўся да маладога папаўнення **начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Андрэй ПРАЖОГІН.**

З адметнай падзеяй маладых супрацоўнікаў павіншавалі таксама ветэраны МНС і бацькі. Протаіерэй Сяргей Лабада акрапіў ратавальнікаў святой вадой. У іх памяці таксама застануцца ўрачысты марш па плошчы пад духавы аркестр і агульнае фота на памяць. У гэты ж дзень лепшыя з прадстаўнікоў ратавальнай службы Магілёўшчыны былі адзначаны ўзнагародамі.

Супрацоўнікамі гэтай гуманнай прафесіі за мінулы год у Магілёўскай вобласці выратаваны 53 і эвакуіраваны 130 чалавек, адваявана ў стыхіі 907 збудаванняў і 74 адзінкі тэхнікі, не дапушчана гібелі больш чым 120 галоў жывёлы. У параўнанні з 2005 годам колькасць пажараў у вобласці скарацілася ў 2,2 раза, а гібель людзей на іх — у 2,7 раза.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ШАНЦ ЯШЧЭ ЁСЦЬ

Карэспандэнт «Звязды» Дар'я Лабажэвіч перадае з французскага Руана, дзе праходзіць 25-ы чэмпіянат свету па гандболе

**Нашы гандбалісты хоць і прайгралі трэці матч чэмпіянату свету, але далі бой немцам і захавалі магчымасць выхаду з групы.**



Цяпер, аднак, не ўсё ў нашых руках: каб застацца ў гульні сёння нам трэба перамагаць венграў, а вось з якім лікам — залежыць ад выніку сустрэчы Саудаўская Аравія — Чылі. Калі першыя атрымаюць перамогу, то нас задаволяць любыя лічбы на табло, калі ж гэтага не здарыцца, то беларусам неабходна забяспечыць сабе перавагу не менш, чым у 4 мячы.

Тое, што цяпер варыянты пралічвае ўся наша каманда, пасля гульні са зборнай Германіі не хавалі ні самі гульцы, ні трэнеры. Ды мы ўжо і прывыклі да таго, што трэба спачатку ўласнаручна загнаць сябе ў тупік, а потым разлічваць не толькі на сябе, але і на дапамогу іншых. Але крытыкаваць каманду цяпер зусім не хочацца. Таму што ў паядынках з харватамі і немцамі хлопцы паказалі нядрэнную гульню і «біліся» з грандамі сусветнага гандбола на роўных амаль да канца.

Зборная Германіі ў асаблівым прадстаўленні не мае патрэбы. Аматары гандбола ведаюць, што чэмпіянат Бундэслігі з'яўляецца адным з наймацнейшых у свеце і, быццам бы па іроніі лёсу, практычна палова складу сённяшняй нямецкай зборнай прайшла праз рукі Юрыя Шаўцова, які доўгі час працаваў у Германіі. Што да сусветных тытулаў, то немцы былі і чэмпіёнамі Алімпійскіх гульняў, і ўладальнікамі залатых медалёў чэмпіянатаў свету. Калі казаць пра апошнія турніры, то яны выйгралі чэмпіянат Еўропы-2016, сталі таксама бронзавымі прызёрамі Алімпіяды ў Бразіліі. На турніры ў Францыі Германія пакуль не ведае паражэнняў, сёння яна згуляе з харватамі, але наўрад ці нешта зможа зрушыць немцаў з першай пазіцыі групы С.

Але, як аказалася, нашы гульцы могуць збянтэжыць нават настолькі масцітага саперніка. Першыя 10 хвілін матча мы ні ў чым не саступалі чэмпіёнам кантынента, а потым Вячаслаў Салдаценка сваім дакладным кідком па чужых варотах нават вывеў нашу каманду наперад. Адрыў павялічыў Арцём Каралёк, што прымусіла нервавацца рулявога немцаў Дагура Сігурдсана і браць тайм-аўт.

На перапынак сапернікі пайшлі з роўным лікам на табло 16:16. А вось пасля адпачынку зборная Германіі змянілася. Немцы прымушалі нас памыляцца, рабіць неабавязковыя страты мяча, стараўшыся забяспечыць сабе камфортны адрыў у некалькі галоў. Канчатковы лік сустрэчы 25:31 не на нашу карысць.

**Іван МАЦКЕВІЧ:**

*— Сёння мы ні ў чым не саступалі немцам. Самі прайгралі гэты матч, зрабілі шмат памылак у другім тайме.*

**Дзяніс РУТЭНКА:**

*— Шмат у чым гульня ў нас атрымалася. Яна стала падобнай на папярэдні матч з харватамі. За кошт сваіх памылак у нападзенні атрымалі хуткія контратакі, з-за гэтага немцы і адарваліся. Усе разумелі, што немцы — фаварыты, і многага ад нас не чакалі. Таму мы спакойна, без ціску выходзілі на гэты матч. Былі памылкі, але яны тлумачацца не хваляваннем...*

*Цяпер, вядома, сочым за гульнямі іншых каманд у групе, пралічваем варыянты. Трэба выходзіць і выйграваць у венграў. Мы паказалі дзве добрыя гульні. Калі будзем так гуляць і з імі, плюс зробім хоць бы на некалькі памылак менш, то праблем быць не павінна.*

*У нас вельмі добры калектыў, пасля сыходу са зборнай брата няма такога чалавека, які мог бы, як Сяргей, узяць ініцыятыву на сябе, але затое цяпер задзейнічана ўся каманда.*

**Юрый ШАЎЦОЎ:**

*— Каманда Германіі ўзяла верх за кошт вопыту. Мы вельмі добра згулялі першы тайм, у пачатку другога зрабілі шмат страт, а дагнаць такую каманду ўжо вельмі складана. Было выразна відаць, як немцы каралі нас за памылкі. І зборная Харватыі, і Германія нашмат больш вопытныя за нашых хлопцаў з чэмпіянату Беларусі. Гэта гульцы, якія ў Бундэслізе ў гэтым сезоне ўжо згулялі па 28 матчаў са звышлімітным напалам. А мы, на жаль, толькі вучымся на такіх турнірах, як чэмпіянат свету.*

*Гульня са зборнай Венгрыі — гэта наш апошні шанц, трэба выходзіць на пляцоўку і паказваць патрэбны нам вынік.*

## ■ Прамысловы турызм

# МТЗ ЁСЦЬ ШТО ПАКАЗАЦЬ

**Сёлета Мінскі трактарны завод адкрывае дзверы для арганізаваных груп наведвальнікаў-турыстаў. Менавіта ў такім шырокім і адкрытым фармаце на прадпрыемстве плануюць развіваць прамысловы турызм, паведамляе спецыяліст па сувязях з грамадскасцю завода Павел ТУХТО.**

Ужо сёння на прадпрыемстве гатовы прымаць турыстаў, а зараз спецыялісты фарміруюць заяўкі. Тэрыторыя завода вялікая, а вытворчасць спецыфічная, таму экскурсіі плануецца рабіць выключна для груп з пэўным маршрутам. Паводле слоў Паўла Тухто, ужо ёсць першая заяўка на люты групы з 40 чалавек з Літвы. Аднак на заводзе разлічваюць, што першую экскурсію тут правядуць яшчэ ў студзені. Спецыяліст растлумачыў, што падчас экскурсіі можна будзе прасачыць увесь тэхналагічны ланцужок вытворчасці: ад механічнага цэха, дзе выраблююць шасцерні і валы, да корпуса зборкі трактароў — галоўнага канвеера прадпрыемства. Таксама турысты ўбачаць выставу трактароў і азнаёмяцца з найноўшай лінейкай тэхнікі BELARUS. Нагадаю, што Мінскі трактарны завод быў заснаваны яшчэ ў 1946 годзе, а цяпер тэхніка прадпрыемства прадаецца на рынках больш чым 60 дзяржаў, а завод уваходзіць у васьмёрку найбуйнейшых сусветных вытворцаў колавых трактароў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# У Мінску мастацтва становіцца даступным для невідушчых

**У Нацыянальным мастацкім музеі з'явілася 25 спецыяльных аўдыягідаў для невідушчых. Іх падрыхтавала каманда валанцёраў — супрацоўнікаў Беларускага таварыства інвалідаў па зроку і экспертаў музея.**

Аўдыягіды для невідушчых не толькі расказваюць гісторыю карціны, але і падрабязна апісваюць, што на ёй намалявана, напрыклад, як размешчаны прадметы ці людзі на карціне, якая колеравая гама і г.д.

Такім жа чынам невідушчыя і слабавідушчыя могуць знаёміцца і з іншай візуальнай мастацкай творчасцю (фільмамі, тэатрам, скульптурамі і г.д.). Тэхніка, дзякуючы якой гэта становіцца магчымым, называецца аўдыядэскрыпцыяй. Падчас аўдыядэскрыпцыі славеснае апісанне сцэн дазваляе сляпому чалавеку «ісці» за падзеямі, а таксама чуць і разумець усё, што адбываецца на карціне, сцэне, экране. Нядаўна ў Беларусі быў праведзены навучальны курс па стварэнні аўдыядэскрыпцыі, адным з арганізатараў якога быў Офіс па правах людзей з інваліднасцю.

Нацыянальны мастацкі музей і далей плануе станавіцца ўсё больш даступным для людзей з інваліднасцю. Так, наступнай задачай супрацоўнікі музея бачаць стварэнне аўдыягіда для дзяцей са слабым зрокам і планшэтных аўдыягідаў для глухіх людзей.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ■ Надвор'е

# Мокры снег і дождж

Уначы будзе падмарожваць да мінус 9 градусаў, а часам і да минус 10—12

**На выхадныя і ў пачатку наступнага тыдня на тэрыторыі Беларусі чакаецца суцэльная галалёдзіца, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

А справа ў тым, што да нас ужо ў чацвер завітала цёплае паветра атлантычнага паходжання. Таму ў пятніцу на тэрыторыі краіны пачнуць гаспадарыць атмасферныя франты, якія прынясуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу з дажджом. У асобных раёнах краіны чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. У суботу надвор'ем будзе кіраваць чарговая франтальная сістэма, якая перамяшчаецца з акваторыі Балтыйскага мора. Захаваецца няўстойлівае надвор'е з элементамі адлігі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла. А вось у нядзелю пачнецца рост атмасфернага ціску, надвор'е палепшыцца, і крыху падмарозіць. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў паўднёва-заходніх раёнах, а ўдзень месцамі па поўначы краіны магчымы невялікі снег. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Уначы стане крыху халадней, калі тэмпература паветра панізіцца да 2—9 марозу, а па паўночным усходзе — нават да мінус 10—12 градусаў. Удзень тэмпература паветра складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, а па захадзе — да 2 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першы дзень наступнага тыдня ў Беларусь завітае атмасферны фронт з «прапіскай» над Скандынаўскім паўвостравам. Атмасферны ціск пачне расці. Чакаецца, што ў панядзелак уначы ў асобных раёнах, а ўдзень пераважна па паўночнай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 марозу, а ўдзень будзе вагацца ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла. Захаваецца ўплыў атмасферных франтоў са Скандынавіі і ў аўторак. На большай частцы Беларусі прагназуецца кароткачасовы мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, пры праясненнях — да 10 марозу. А ўдзень ізноў чакаецца не зусім студзеньскае ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ГРОШЫ НА КВЕТКАХ І ПРЫЧОСКАХ



Фота Надзеі БУЖАН.

**Адзін з прыбытковых відаў дзейнасці на вёсцы — сельская гаспадарка. Канкурэнцыя, вядома, ёсць, але на 100 працэнтаў ніша не запоўнена.**

## СУВЕНІРЫ ДЛЯ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

Ігар Курленя жыве ў аграгарадку Мажэйкава Лідскага раёна. Па спецыяльнасці ён станочнік: скончыў мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж у Кобрыне. Як ён сам кажа, хобі — разьба па дрэве — перарасло ў прафесію.

Мужчына працаваў спачатку на Лідскай мэблевай фабрыцы. Потым пасля арміі ўладкаваўся да прыватніка. Прадпрыемства знаходзілася ў Мінскай вобласці: вакансіі бліжэй да дома знайсці не ўдалося. Таму Ігар задумаўся над тым, каб адкрыць сваю справу і працаваць на сябе. У лістападзе 2015 года звярнуўся ў раённую службу занятасці. Там яму дапамаглі скласці бізнес-план і выдалі субсідыю (для тых беспрацоўных, хто збіраецца займацца прадпрымальніцтвам у сельскай мясцовасці, яна складае 15 бюджэтаў пражытачнага мінімуму — на сёння гэта каля 2,6 тысячы рублёў). На гэтыя грошы мужчына набыў неабходны інструмент, матэрыял для выпуску прадукцыі на пачатковым этапе.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Раблю сувеніры з дрэва, посуд, упрыгажэнні для мэблі, — расказвае ён пра сваю дзейнасць. — Дзе прадаю потым? На кірмашах бываю, яшчэ частка вырабаў па знаёмых разыходзіцца. Сувеніры ў Белавежскую пушчу пастаўляю.

У планах Ігара — пашыраць вытворчасць. Мужчына збіраецца майстраваць альтанкі. Але для гэтага патрэбны станкі, на якія пакуль не хапае фінансаў. Таму цяпер умелец шукае новыя пункты збыту сваёй прадукцыі. «Хачу сувеніры яшчэ ў Лідскі замак перадаваць, цяпер дамаўляюся», — дзеліцца рамеснік.

## САДОЎНІКА ВЫКЛІКАЛІ?

Запатрабаваную сёння прафесію заатэхніка Аляксандра Шышонак з вёскі Ведрыца Чэрвеньскага раёна атрымала ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Але кім толькі ні працавала: і ў арміі па кантракце служыла, і мастацкім кіраўніком у клубе была. А ў выніку знайшла сябе ў садаводстве.

— Усё жыццё захаплялася кветкамі, як і мама, — тлумачыць свой выбар жанчына. — Яшчэ да таго, як адкрыла сваю справу, вырошчвала ружы. Людзі падыходзілі, цікавіліся, ці можна набыць. Так попыт нарадзіў прапанову.

**Статыстыка**

**Самыя запатрабаваныя рабочыя прафесіі на вёсцы — аператар машыннага даення і трактарыст. Сярод спецыялістаў найбольшым попытам у наймальнікаў карыстаюцца ветэрынары, заатэхнікі, медыцынскія сёстры, урачы, інжынеры і бухгалтары. А вакансій эканамістаў і юрыстаў, якія ў горадзе традыцыйна ў дэфіцыце, у сельскай мясцовасці больш, чым беспрацоўных, што прэтэндуюць на іх.**

У сваім кветніку Аляксандра вырошчвае ружы, хвойныя расліны, петуніі. «Раблю акцэнт на такія кветкі, якія карыстаюцца папулярнасцю ва ўсе часы. Калі на лілііі, бавоўнік інтарэс ідзе хвалямі, то ружа заўсёды добра прадаецца. Спрабую чаранкаваць кветкі, каб яны былі больш прыстасаваныя да нашага клімату, каб не было такога клопату з укрыццём, хваробамі».

Пакупнікоў удаецца знайсці праз знаёмых. Як той казаў, сарафаннае радыё — найлепшая рэклама. Расаду набывае таксама школа, асобныя прадпрыемствы для сваіх клумбаў.

— У гандлёвых пунктах абарот ідзе за кошт калькасці тавару. Я ж раблю стаўку на якасць, каб пакупнікі наступным разам звярталіся менавіта да мяне, — расказвае пра сваю стратэгію Аляксандра.

Акрамя развядзення кветак, жанчына займаецца яшчэ ландшафтным дызайнам: з дапамогай спецыяльнай камп'ютарнай праграмы распрацоўвае праекты азелянення прысядзібных участкаў. Аказвае таксама паслугі садоўніка.

— Звяртаюцца часам пенсіянеркі, якія адны пражываюць, просяць у дрэва галінкі абрэзаць ці куст падстрыгчы. У нас наймаць садоўніка непапулярна, лепш самому як-небудзь участак дагледзець. Але кожнай работай павінен займацца спецыяліст, — мяркуе Аляксандра.

Яна ўспамінае, што свой бізнес пачала з наладжвання кантактаў і вывучэння чужога вопыту. Ездзіла да іншых ландшафтных дызайнераў па вобласці, звязвалася з фермамі, якія займаюцца пастаўкай расады. А атрыманую субсідыю патраціла на набыццё садовага інвентару — цяпліцы, сістэмы крапельнага паліву і інш.

— Ведаю, што некаторыя прадпрымальнікі-пачаткоўцы закупляюць на гэтыя грошы тавар, але, я лічу, гэта немэтазгодна, — кажа Аляксандра. — Лепш патраціць іх на абсталяванне, якое праслужыць табе некалькі гадоў.

## НА ВЁСЦЫ ПАТРЭБНЫ ПАСЛУГІ

Пра тое, якія кірункі прадпрымальніцкай дзейнасці найбольш перспектыўныя ў сельскай мясцовасці, расказвае **намеснік загадчыка кафедры эканомікі і кіравання Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Мінпрацы і сацабароны Наталля ДОЛБІК:**

— Зразумела, на вёсцы выгадна займацца сельскай гаспадаркай: гадоўляй буйной рагатай жывёлы, свінагадоўляй, гадоўляй трусоў, вырошчваннем бульбы (для насельніцтва і юрыдычных асоб па заказах). Прыбытковасць справы залежыць ад якасці прадукцыі, затратнасці на яе вытворчасць і таго, наколькі фермер гатовы ўдзяліць увагу пошуку патэнцыйных пакупнікоў. Я разумею, што канкурэнцыя вельмі вялікая, але яна ёсць усюды. Заўсёды нейкія вытворцы сыходзяць з рынку, пераходзяць у іншую сферу. Разам з тым сказаць, што ніша запоўненая на 100 працэнтаў, немагчыма ні пра які кірунак. Усё знаходзіць свайго пакупніка. Проста трэба прымяняць розныя маркетынгавыя стратэгіі.

У сельскай мясцовасці патрабуюцца таксама розныя паслугі. Той жа рамонт абуткy і адзення, цырульні, фітнес, танцы, цэнтры для дзяцей. «Гэтыя віды дзейнасці развіваюцца яшчэ лепш, чым гаспадарка, — заўважае Наталля Долбік. — Калі ў Мінску такіх паслуг шмат, то ў вёсках яны ўвогуле адсутнічаюць».

Вясковыя бізнесмены могуць различваць на істотныя льготы. Так, згодна з Дэкрэтам №6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці», вытворцы ўласнай прадукцыі вызваляюцца на 7 гадоў ад падаткаў. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія плацяць адзіны падатак, могуць атрымаць па ім добрыя льготы, бо мясцовыя выканаўчыя органы маюць права прымаць рашэнне аб паніжэнні гэтых ставак.

У раёнаў ёсць праграмы развіцця рэгіёнаў, на якія выдаткоўваецца пэўнае фінансаванне: тыя, хто хоча адкрыць сваю справу, могуць разлічваць на грашовую дапамогу ў рамках гэтых праграм. Плюс ёсць магчымасць атрымання грантаў. Цяпер шмат еўрапейскіх праграм аказваюць падтрымку развіццю менавіта сельскай ініцыятывы. Гранты невялікія, але для прыватніка з'яўляюцца істотнымі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# Крыніца антысанітарыі ці прыкмета камфорту?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы вырашылі правесці своеасаблівы эксперымент: у адной з сацыяльных сетак «кінулі кліч», шукаючы людзей, якія сартуюць смецце. Літаральна за гадзіну адгукнулася некалькі дзясяткаў чалавек.

Адной са свядомых мінчанак аказалася Юлія Ільюшонак. У гэтым пытанні ёй пашанцавала крыху больш, чым астатнім. Разам з сям'ёй маладая жанчына жыве на першым паверсе шматкватэрнага дома.

— У нас смеццеправод не завараны, але мы ім не карыстаемся. Нам зручней вынесці адходы ў кантэйнер на двары. Раней смеццеправод рэгулярна быў забіты, таму мы вырашылі ад яго адмовіцца.

Юлія прызнаецца, што цалкам усё смецце яны не сартуюць, бо не ўсе члены сям'і падтрымліваюць яе пачынанні, якія хоць трохі, але ўсё ж такі ўскладняюць жыццё. Сама яна аддзяляе пластык і макулатуру ад астатняга ўжо каля двух гадоў. Падштурхнула да гэтага ўсяго толькі стварэнне адпаведных умоў — з'яўленне ў двары дома спецыялізаваных кантэйнераў.

— На жаль, не ўсе яшчэ прывыклі нават да самой думкі сартавання смецця. Часта назіраю ў кантэйнерах, напрыклад, для пластыка агульныя адходы. Невядома, гэта ад няведання, ляноты ці шкоднасці? — разважае Юлія.

Што датычыцца асобнага збору паперы, то на гэта маладую маму натхнілі «спаборніцтвы» ў дзіцячым садзе.

— Мы змагаемся, якая група больш макулатуры назбірае. Мне здаецца, гэта менавіта тая савецкая традыцыя, якую абавязкова варта захаваць. Акрамя непасрэднай карысці, яна яшчэ і прышчапляе дзецям з ранняга ўзросту добрую звычку, — адзначыла Юлія.

Шкло жанчына таксама нядаўна пачала аддзяляць, пасля таго як спецыяльны кантэйнер з'явіўся ў двары дома, праўда, суседняга.

— Я мела магчымасць пабываць у адной з вёсак Германіі, дзе даўно пагледзець як немцы стаўяцца да смецця. Калі ў нас адносна чыста, таму што прыбіраюць, то ў іх чыста, таму што не засмечваюць. Мне вельмі спадабалася, што шкляную і алюмініевую тару можна было здаваць у гандлёвыя пункты: у гэтым выпадку вяртаецца падатак за іх, які спаганяецца пры продажы.

Яшчэ адзін паказальны для мяне прыклад — гісторыя маёй знаёмай, якая пэўны час жыла ў Швецыі. Там да пытання сартавання смецця ставяцца вельмі строга, сістэма добра наладжана, нават спецыяльныя пакеты прадаюцца толькі з адмысловымі абазначэннямі. Аднойчы ёй прыйшоў штраф за тое, што ў смецці з пластыкам была выяўлена папера.

**Каментарый спецыялістаў дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка»**

**На цяперашні момант ва ўсіх раёнах сталіцы закрыты 1624 стваолы смеццеправодаў, у тым ліку 1009 стваолаў у 385 жылых дамах часткова або цалкам былі завараны летась. У гэтым годзе плануецца закрыць яшчэ 1130 стваолаў смеццеправодаў.**

**У аб'яднанні зафіксаваны адзінкавыя выпадкі звароту з ініцыятывай заварвання смеццепровода, аднак пасля правядзення «працэдуры» скаргі ад жыхароў не паступаюць.**

**Пры правядзенні гэтай работы КУП ЖКГ раёнаў г. Мінска кіруюцца тым, што сістэма смеццевыдалення жылога дома адносіцца да агульнай маёмасці сумеснага домаўладання. У сувязі з гэтым, згодна з дзеючым заканадаўствам, закрыццё смеццеправодаў праводзіцца па выніках праведзеных сходаў з жыхарамі або апытанняў пры згодзе простай большасці ад агульнай колькасці ўдзельнікаў агульнага домаўладання. Разам з тым на закрыццё стваолаў смеццеправодаў уплываюць звароты інвалідаў і пажылых людзей, якія пражываюць у доме.**

**Да якіх вынікаў гэта прывяло? Калі ў 2014 годзе ў Мінску было сабрана крыху больш за 8 тысяч тон паперы, шкла і палімераў, то ў 2015-м — ужо 11,3 тысячы, а ў 2016-м — 12,4 тысячы тон. Доля адсартаванага смецця вырасла з 5—10% да 30%. Увогуле, дынаміка станоўчая. Прычым двары большасці жылых дамоў укамплектаваны ў сістэму асобнага збору смецця ўжо некалькі гадоў. Выключэнне — тэрыторыі, дзе ёмістасці проста няма дзе паставіць ці смеццявоз не зможа іх забраць з-за адсутнасці разваротнай пляцоўкі. Тады жыхароў апавяшчаюць, што ў крокавай даступнасці ёсць адпаведныя кантэйнеры.**





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Думаю, нам было б нядрэнна прымяніць падобны вопыт. Увесці санкцыі за парушэнне правілаў сартавання. Пакуль гэтага не будзе, сітуацыя глабальна не зменіцца, бо народ у нас такі: маўляў, навошта сартаваць, калі можна і так выкінуць, — падвяла вынік Юлія.

А вось амаль 80-гадовая Ганна Ільінічна, якую мы знайшлі, вядома, не ў інтэрнэце, прытрымліваецца іншага меркавання. Пажылая жанчына жыве адна, на 7-м паверсе, таму завараны смеццепровод можа стаць для яе сур'ёзнай праблемай.

— Калі быў моцны мароз, я тыдзень не выходзіла на вуліцу. Хлеб, малако прасіла суседку мне купіць. Але не змагу ж я звярнуцца да яе з просьбай выкінуць смецце. Гэта ж непрыстойна! Аднак калі яно некалькі дзён будзе стаяць у кватэры, таксама непрыемна.

Мне складана разабрацца ў ідэі сартавання смецця, таму я не магу сказаць «за» я ці «супраць». Але кідаць пажылых людзей на волю лёсу, маўляў, разбірайцеся самі, таксама нельга. Хай тады той, хто прыбірае пад'езды, перыядычна абыходзіць нашыя кватэры і забірае ў нас смецце. Калі гэта будзе адбывацца праз дзень, то я нават гатовая збіраць яго ў розныя пакеты, — абяцае пенсіянерка.

З аднаго боку — Ганна Ільінічна, безумоўна, мае рацыю, але з іншага — заўсёды будуць пажылыя людзі, якім будзе няручна абыходзіцца без смеццеправоду, так што без прынядення нязручнасцяў адмовіцца ад яго не атрымаецца ніколі. І, можа, ісціна гаварыць менавіта вуснамі пажылой жанчыны: крыху дапамогі — і абурэнняў стане куды менш, а карысці прыроды — больш?

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ПРЫГОЖА СПЯВАЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

## Сёння — фінал нацыянальнага беларускага адбору на «Еўрабачанне-2017». Хто пазмагаецца за пуцёўку на міжнародны конкурс?

**Набліжаецца да развязкі чарговая тэлевізійна-музычная меладрама пад назвай «нацыянальны беларускі адбор на конкурс песні «Еўрабачанне». У прамым эфіры 20 студзеня па выніках гала-канцэрта тэлегледачы і прафесійнае журы выберуць таго, хто прадставіць сёлета Беларусь на міжнародным конкурсе ў Кіеве. На тытул пераможцы, нагадаем, прэтэндуюць 13 фіналістаў. А паколькі імёны многіх з іх мала што гавораць шырокай публіцы, «Звязда» склала невялікі ілюстраваны даведнік, хто сабой што ўяўляе, аб чым спявае і куды імкнецца. Такім чынам, прадстаўляем сёлетніх кандыдатаў у парадку выступлення на конкурсе:**

### 1. ІЮЛЬ (Юлія Каранюк) — Children of the World



25-гадовую ўраджэнку Драгічына некаторыя памятаюць па тэлепраекце «Акадэмія талентаў 4» на АНТ. Дзяўчына некалькі гадоў спрабавала пачаць сольную кар'еру, але ўсё нешта не складвалася. Другое дыханне спявачка набыла з дапамогай прадзюсарскага цэнтра Jackpot, заснавальнікі якога — саліст гурта «Чук і Гек» Дзмітрый Фаміч і тэлевядучая Ксенія Дзюкава-Фаміч — прапанавалі Юлі новае сцэнічнае імя, вобраз і рэпертуар. Спецыяльна для «Еўрабачання» была напісана песня Children of the World з празрыстым заклікам да інтэрнацыянальнага сяброўства і міру ва ўсім свеце, паколькі «усе мы — дзеці адной зямлі».

Сярод пераваг Юлі Каранюк — байцоўскі характар, загартаваны 10 гадамі тэхвандо (у спявачкі чорны пояс), выдатнае валоданне англійскай і падрыхтаванья для фіналу «фішкі», сярод якіх відэаінсталяцыя і вялікі бубен дыяметрам 1,5 метра.

### 2. Аляксандра Ткач — Be Stronger



Мінчанка Саша Ткач, яна ж спявачка Lexy Weaver — самая юная фіналістка не толькі сёлетняга адбору, але і ўсіх папярэдніх — дзяўчыне ўсяго 16 гадоў, яна навучэнка адной са сталічных гімназій. Зрэшты, за плячыма ў юнай артысткі ўжо добры дзясятак музычных конкурсаў у Беларусі, Расіі, Літве і Украіне, вопыт удзелу ў прыбалтыйскім і польскім шоу «Голас». Акрамя таго, дзяўчына дыстанцыйна вывучае музычнае прадзюсіраванне ў амерыканскім каледжы, а ў перспектыве плануе працягваць сцэнічную кар'еру менавіта на Захадзе.

Конкурсную песню Саша напісала сама, і прысвечана кампазіцыя не першаму каханню, як падумалі некаторыя, а, калі можна так сказаць, юнацкаму імпэту, стойкасці духу і жаданню стаць мацнейшым, нягледзячы на ўсе выпрабаванні.

### 3. Уладзіслаў Курасаў — Follow the Play



21-гадовы ўраджэнец Брэста практычна ўсё свядомае жыццё правёў у суседняй Украіне, а таму лічыцца «украінскім выканаўцам беларускага паходжання». У яго актыве — некалькі мастацкіх школ і тэатральных студый, удзел у тэлешоу «Хвіліна славы», «Зорны рынг» і «Х-Фактар 2», запіс 5 відэакліпаў і сольнага альбома, а таксама леташні праход у паўфінал украінскага нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне-2016».

Песня, якую напісаў сам Уладзіслаў, — аўтабіяграфічная: «Уявіце, што сустракаеш чалавека, у адносінах да якога раней перажываў шалёныя пачуцці, і раптам разумееш, што ўсё мінула. І цяпер можна «згуляць у каханне» проста дзеля ўспамінаў пра былыя пачуцці — ператварыць колішнюю драму ў фарс».

### 4. Гурт Navi — «Гісторыя майго жыцця»



Радыёвядучаму, музыканту Арцёму Лук'яненку і педагогу па вакале Ксеніі Жук менш як 50 гадоў на дваіх, а яны ўжо ў добрым сэнсе нарабілі шуму, і не толькі на айчыннай эстрадзе. За чатыры гады існавання Navi атрымалі нацыянальную музычную прэмію «Ліра», перамаглі ў некалькіх міжнародных конкурсах, выпусцілі дзве пласцінкі, спадабаліся расійскім тэлеканалам і запісалі сумесную песню з модным расійскім пісьменнікам Яўгенам Грышкавуком.

Песня «Гісторыя майго жыцця» вылучаецца мілагучнасцю і непадробнай шчырасцю — бо напісана пра любоў да зямлякоў і роднай краіны. Дуэт марыць прадставіць родную краіну на «Еўрабачанні» на беларускай мове. Аднак гэта не адзіная і далёка не галоўная іх мэта: акрамя выступлення ў фінале адбору, артысты прэзентуюць свой новы альбом «Ілюмінацыя».

### 5. Isaac Nightingale (Вадзім Капусцін) — Red Line



Масквіч Вадзім Капусцін, які апошнія некалькі гадоў жыве і працуе ў Лос-Анджэлесе, — самы ўзроставы ўдзельнік у фінале нацыянальнага адбору. «Салаўю» Айзэку Найцінгейлу (пад такім псеўданімам працуе цяпер Вадзім) 43 гады, і ў яго творчай скарбонцы — праца ў Берлінскім камерным тэатры, 12 гадоў спеваў у папулярным джазавым гурце, удзел у тэлешоу «Голас-5» і падрыхтоўка сольнага альбома. На адбор у Мінск, як сцвярджае Вадзім, яго прывялі беларускія карані бацькі і сябры-музыкі з нашай краіны.

Песня Red Line, паводле слоў артыста, — пра тое, што мы (Еўропа. — **Аўт.**) падышлі да нябачнай і небяспечнай рысы, за якой чакае цэлы шэраг вострых праблем, і наспеў час іх вырашаць. Карацей кажучы, гэткі музычна-кан'юнктурны заклік да міру, ладу і супрацоўніцтва.

### 6. Kattie (Кацярына Рудніцкая) — Wild Wind



Выпускніцы Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў давялося папрацаваць некалькі гадоў у караоке-барах вядучай і бэк-вакалісткай, каб пазбавіцца боязі сцэны і публікі. Цяпер у 24-гадовай спявачкі ёсць упэўненасць у сабе, вопыт удзелу ў конкурсах і патрэбныя знаёмствы ў музычным свеце.

Песня Wild Wind, напісаная шведскімі аўтарамі Anders Hansson і Sharon Vaughn, пры вонкавым падабенстве да рамантычнай балады насамрэч прысвечаная ахвярам тэрактаў і заклікае да супрацьстаяння гвалту і болю, што нясуць ваенныя канфлікты па ўсім свеце.

### 7. Nuteki — Take My Heart



27-гадовы рокер Міхаіл Накарашвілі з калегамі — можна сказаць, ветэраны беларускага адбору, для іх гэта ўжо чацвёртая спроба прарубіць музычнае акно ў Еўропу. Хоць гурт і без таго не скардзіцца на незапатрабаванасць — за 10 гадоў хлопцы выпусцілі 3 студыйныя альбомы і 13 кліпаў, шмат гастралявалі па СНД і Еўропе, запісвалі песні да кінафільмаў.

Песня Take My Heart закранае вечную тэму пошукаў маральных арыенціраў і сапраўдных каштоўнасцяў, выбару паміж правільным і памылковым. У кампазіцыі зусім нядаўна з'явілася беларускамоўная версія «Так кахаць» — і, магчыма, яна часткова або цалкам прагучыць на сённяшнім канцэрце.

### 8. Napoli — Let's Come Together



Яшчэ адзін пастаянны ўдзельнік нацыянальнага адбору, які з гурта паступова ператварыўся ў сольны праект выпускніцы ўніверсітэта культуры Вольгі Шыманскай. Чатыры гады запар Napoli траплялі ў фінал адбору на «Еўрабачанне», кожны раз прадстаўляючы новы вобраз і гучанне.

Песня Let's Come Together — вынік творчасці брытанца Майкла Джэймса Даўна, славенца Прыможа Паглаена і шведа Нікласа Хаста, аранжыроўку ж зрабіў беларус Антон Саладуха (сын Аляксандра Саладухі). Па сутнасці, гэта просты і аптымістычны заклік аб'ядноўвацца, каб разам ісці наперад і пераадолець усе цяжкасці. У песні таксама ёсць беларускамоўныя версіі. Дакладней, як расказала «Звяздзе» спявачка, іх ужо больш як 12: «Мы звярнуліся ў сацсетках да прыхільнікаў, але, па шчырасці, я не думала, што столькі людзей адгукнецца на прапанову стварыць варыянт песні на роднай мове. Ёсць вельмі цікавыя тэксты і, магчыма, мы запішам нават некалькі варыянтаў, каб пазней выконваць іх на канцэртах і ў Беларусі, і за межамі нашай краіны».

### 9. Мікіта Ходас — Voices in My Head



19-гадовы ўраджэнец Гомеля — настолькі «хлопец з народа», што дзіву даешся, як гэта яго занесла на «Еўрабачанне». Юнак са шматдзетнай сям'і, які працуе мыйшчыкам посуду ў сталічным рэстаране і спявае ў пераходах не толькі дзеля ўласнага задавальнення, але і каб зарабіць на жыццё, а разам з тым займаецца музыкай і не пакідае мары стаць прафесійным артыстам. Дапамагае яму ў гэтым педагог па вакале Святлана Гарбаценка і невялікая творчая каманда аднадумцаў.

Як няцяжка здагадацца, конкурсную песню хлопец напісаў сам — гэта і ёсць яго жыццёвая гісторыя, пакладзеная на музыку. Ніякіх фішак і спецэфектаў Мікіта не абяцае, хоча зачапіць слухачоў шчырасцю і быць сабой.

### 10. Анжаліка Пушнова — We Should Be Together



19-гадовай мінчанцы, мабыць, было наканавана стаць спявачкай — нездарма бацькі нават імя ёй далі ў гонар спявачкі і актрысы Анжалікі Ялінскай. На рахунку маладой артысткі — некалькі музычных прэмій і конкурсаў, у тым ліку беларуская «Песня года». Але да «Еўрабачання», прызнаецца дзяўчына, яна прыйшла не па слядах старэйшай цёзкі, а пад уражаннем ад канцэрту шведскага адбору Melodiefestivalen. Да таго ж сябар Кірыл Ермакоў (пастаянны ўдзельнік адбораў на дзіцячае «Еўрабачанне» і фіналіст леташняга адбору на «дарослы» конкурс) прапанаваў сваю песню — на думку Анжалікі, вельмі «еўравізійную».

Пасыл кампазіцыі зразумелы ўжо з самой назвы — «Мы мусім быць разам, нягледзячы ні на што». Дарэчы, заклік да таго, каб быць разам, гучыць у трох з 13 песень сёлетніх фіналістаў беларускага адбору.

### 11. Анастасія Шэвярэнка — We'll Be Together



Музычная студыя, конкурсы патрыятычнай песні, тэлепраекты «Крутыя работы» і «Акадэмія талентаў» — пасля ўсяго гэтага 24-гадовая спявачка магла папоўніць шэрагі беларускіх поп-артыстаў, але аддала перавагу джазу, соўлу і рабоце з жывой музыкай у клубах ды рэстаранах. Уласна, там яе сустрэў прадзюсар Максім Алейнікаў і прапанаваў сваю песню і падтрымку для адбору на «Еўрабачанне».

На праслухоўванні лірычная кампазіцыя пра каханне пераканала суддзяў — а да гала-канцэрту прадзюсар і спявачка абяцаюць яе максімальна дапрацаваць і палепшыць.

### 12. Lermont x Julic — Heartbeat



Васіль Сялішчаў і Антон Рубацкі, якія стаяць за сцэнічнымі імёнамі Lermont і Julic, на прафесійнай сцэне ўжо далёка не першы год. Васіля-Лермонта слухачы могуць памятаць па гурце «Август», ён жа «Альбіён», ён жа «Лермонт», чый дэбютны кліп «Мінімум рэзкасці» стаў найлепшым музычным відэа 2010 года, Антона прыхільнікі ведаюць па гуртах Dali і Rostany.

Абодвум музыкам пад 30 — і ім ёсць што сказаць публіцы. Так, конкурсная песня Heartbeat прысвечана свабодзе і каханню, сэрцабіццю ва ўнісон, якое аб'ядноўвае самых розных людзей. Дарэчы, прадставіць яе на беларускім адборы хлопцам параіў удзельнік «Еўрабачання-2014» Тэа.

### 13. Гурт «PROвокация» — My Love




Марк Войтка і Арцём Саладуха працуюць у Маладзёжным тэатры эстрады, вучацца ва ўніверсітэце культуры на вакалістаў, але фактычна з'яўляюцца падапечнымі прадзюсара Анатоля Чэпікава, які два гады таму і зляпіў з хлопцаў дуэт. Ён жа падрыхтуе іх да «Еўрабачання» — а калі тут не пашанцуе — то да адбору на наступны конкурс «Новая хваля».

Тэкст да песні, дарэчы, напісаны навучэнцам духоўнай семінарыі і расказвае не столькі пра каханне, колькі пра любоў у шырокім сэнсе — як стваральнае пачуццё і тое, што нас аб'ядноўвае.

***

**Фінальны гала-канцэрт будзе транслiравацца ў прамым эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24» і анлайн на сайце tvr.by. У шоу, акрамя прэтэндэнтаў, выступяць спецыяльныя госці — Тэа, Юзары і Ivan, якія ў розны час прадстаўлялі Беларусь на конкурсе, і некалькі яркіх канкурсантаў з сёлетняга адбору.**

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

## Аўторак, 24 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10** Спецыяльны рэпартаж.
**9.30, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Ліст чакання». 1-я серыя.**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.55** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.30** Дзень спорту.
**0.45 Серыял «Паляўнічыя на брыльянты».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.25 Серыял «Кухня».**
**10.10, 17.30 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.00, 18.20 Дэтэктыў «Сёмая руна».**
**12.00, 16.40 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.50, 21.30 Серыял «Шурачка». 1-я серыя.**
**13.20, 22.10** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
**14.20, 20.30** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 0.00** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.05** «Як гартаваўся стайл-2». Сіткам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Кухаьн.
**8.00, 11.45, 20.25** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Фурцава». Драма.**
**9.10 «Лясная царэўна». Казка.**
**10.45** «Гітара па крузе».
**12.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.30, 23.15** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**13.00 «Бейбарс». Драма.**
**15.45** «Подых струн».
**16.25** «872 дні Ленінграда». «Выратавальная ніці жыцця».
**17.05, 21.45 «Апошні бранепаезд». Серыял. 1—2-я серыі.**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Выйсце ёсць». Віктар Манаеў.
**20.40** «Калыханка».
**21.05** «872 дні Ленінграда». «Кіраванне катастрофай».

### Беларусь 5

**8.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.40** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Масстарт. Мужчыны.
**9.45** Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Эстафета. Жанчыны.
**11.15** Баскетбол. Еўраліга. «Жальгірыс» (Літва) — «Рэал» (Іспанія).
**12.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва» (Мінск) — «Нёман» (Гродна).
**14.45** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. «Спарта» (Чэхія) — «Векшэ Лейкерс» (Швецыя).
**16.40** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фіналу. «Фрыбург-Гатэран» (Швейцарыя) — «Фрэлунда» (Швецыя).
**18.35** Авертайм.
**19.05, 22.30** PRO спорт. Навіны.
**19.15** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Аўтамабіліст» (Екацярынбург). У перапынках — Авертайм. КХЛ.
**22.00** Спорт-кадр.
**22.40** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 1/4 фіналу.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Бесталковыя нататкі».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Аляксандр Пракапенка. Народны футбаліст».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Грачанка».**
**22.40 Маст. фільм «Цёмнае каралеўства».**
**0.50** «Блогеры па-флоцку».
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.35, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Далёкія сваякі».
**10.55, 0.15 «NEXT 2». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Джо і Макс».**
**15.45** «Ведай нашых!»
**16.00 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!».
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.40 «Участак лейтэнанта Качуры». Серыял.**

### МІР

**5.00, 19.20 Серыял «Закон і парадак».**
**5.45** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Маша ў законе».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».
**14.15** «Няма праблем!»
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**



**22.15 Маст. фільм «Жыццё на дваіх».**
**23.55 Маст. фільм «Кароль блефу».**
**2.35 Серыял «Хто, калі не я?»**
**5.00** «Вой, мамачкі!»
**5.30** М/ф.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Вы заказвалі забойства».**
**21.45, 23.30 Серыял «Склifасоўскі. Рэанімацыя».**
**23.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**0.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10 Серыял «Адвакат».**
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.40, 23.05** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Брацянікі».**
**12.05** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «За мяжой».
**14.15 Серыял «НС — Надзвычайная сітуацыя».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Чума».**
**21.25 Серыял «Адзін супраць усіх».**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Падарожжы Сіндбада».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Меладрама «Дзённік Брыджыт Джонс».**
**12.50 Серыял «Імперыя».**
**13.45 Трылер «Найміты».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** Мультпарад «Рабінзон Круза».
**17.40 Серыял «Людзі ў дрэвах».**
**18.30 Серыял «Падмані мяне».**
**19.20 Серыял «Здрада».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Камедыя «Па-банку».**
**23.10 Серыял «Барыгі».**




## Даў драла да прымурка

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Прыму́рак** — выступ печы, на якім можна сядзець.

**Кашта́рыс** — дакумент планавання выдаткаў і прыбыткаў. Каштарыс складаюць фінансавыя супрацоўнікі.

**Шчамлёткі** (адно са знач.) — прыстасаванне для заціскання чаго-небудзь.

**Пастро́нкі** — рамяні, якія злучаюць ворчык з хамутом (пры запраганні каня).

**Няўры́мслівы** — які не можа супакоіцца; непаседлівы. Няўрымслівы характар, няўрымслівая натура.

**Засма́глы** — высахлы ад недахопу вільгаці. Засмаглыя губы.

**Падмазваць пяткі** — ратавацца ўцёкамі. Беларускія адпаведнікі: задаць драпака, навастрыць лыжы, даць драла, лататы, маху, цягу, стракача, ходу... Рускія: дать стрекоча, смотать удочки.

**Як снег на галаву** — вельмі нечакана, раптоўна. Беларусы яшчэ могуць сказаць: адкуль ні вазьміся, ні адтуль ні адсюль. Рускія: как гром среди ясного неба.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.05** М/ф «Ёка».
**7.20** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**7.35** М/ф «Маша і мядзведзь».
**7.45** М/ф «Машыны казкі».
**7.50** М/ф «Фіксікі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонины».
**9.30** Камедыя «Суперфарсаж!»
**11.20, 5.00** Серыял «Сакратар».
**12.20** «Паспець за 24 гадзіны».
**13.20, 20.00** Серыял «Вы ўсе прыводзіце мяне ў шаленства».
**14.20** «Мільёны ў сетцы».
**15.00, 2.00** Серыял «Дзетка».
**16.00** Серыял «Мамачкі».
**17.00, 22.50** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Закрытая школа».
**21.00** Драма «За мной апошні танец-2».
**23.30** Серыял «Месяц».
**0.30** «Не можа быць!»
**1.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**3.00** Серыял «Нанакаханне».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Прадаецца мядзведжая шкура». Маст. фільм.
**12.25, 18.10** Сусветныя скарбы.
**12.45** «Эрмітаж».
**13.15, 23.50** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм.
**15.10** «Уяўныя балі». Дак. фільм.
**16.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.50** «Яўген Пятроў, Валянцін Катаеў. Два браты». Дак. фільм.
**17.35** Да 95-годдзя Маскоўскай філармоніі. Яўген Кісін, Арнольд Кац і аркестр Новасібірскай філармоніі ў канцэрце на фестывалі мастацтваў «Руская зіма». Запіс 1987 года.
**18.25** «Алег Вінаградаў. Споведзь балетмайстра». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Гульня ў бісер». «Паэзія Уладзіміра Высоцкага».
**22.00** «Сяргей Гармаш. Маналог у 4 частках».
**22.30** «Адна шпіёнка і дзве бомбы». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**1.25** Іграе Фрэдэрык Кемпф.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Юрый Антонаў. 1994 год.
**6.50** Тэлеспектакль «Ліка». 1978 год.
**8.20** Канцэрт Уладзіміра Дзявятава. 2003 год.
**9.40** Маст. фільм «Звычайная гісторыя».
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: Дайджэст памяці А. Хвасценкі, А. Башлачова, В. Цоя. 2006 год.
**13.05, 15.40, 17.00, 17.40, 19.00, 21.40, 1.00, 1.35** Музычная настальгія.
**13.20** Тэлеспектакль Оскар Уайльд «Як важна быць сур'ёзным». 1976 год.
**14.50, 20.50** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».
**17.20** «Час пік» з Андрэем Разбашам.
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палíткоўскім: «Рэкламны бум па-савецку». 2006 год.
**19.20** Маст. фільм «Чужыя лісты».
**23.05** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» А. Шырвінт і М. Дзяржавін.
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1972. 2-я частка. 2012 год.
**1.25** Дак. фільм «Сумленны фатограф».
**2.00** Дак. фільм «Дысідэнты».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Старэйшы сын».

### EuroSport 1

**3.00, 5.00, 9.00, 11.15, 15.30, 17.30, 20.45, 1.00** Тэніс. Australian Open.
**11.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс»-экстра.
**14.00, 2.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**14.30, 0.00** Тэніс. Матч дня. Выбар Матса Віландэра.
**16.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**19.30, 22.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**23.45** Watts.

### Кінакамедыя

**1.15** Камедыя «Таксі».
**2.55** Камедыя «Таксі-2».
**4.30, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**5.20** Камедыя «Бос у гасцінай».
**7.10** Камедыя «Піжон».
**8.55** Меладрама «Каханне з першага погляду».
**10.30** Прыгоды «Фантамас разбушаваўся».
**12.15** Камедыя «Бамбу».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Падарунак з характарам».
**17.35** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... зноў».
**19.30** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2».
**21.25** Камедыя «Два ў адным».
**23.05** Камедыя «Паўднёвыя моры».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40, 14.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.05** «Доктар І...»
**8.35, 19.00, 2.30** «Асколкі». Серыял.
**10.10, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.55** «Паралельны свет».
**15.25** «Здзелка».
**16.00** «Натуральны адбор».
**17.00, 21.40** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.50, 1.50** «Вяселле і развод».
**22.45,5.30** «Гісторыі выратавання».
**23.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.00** «Мы — Мілеры». Маст. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Фэнтэзі «Філасофы: урок выжывання».
**8.10** Драма «Пераправа».
**10.30** Драма «Помні».
**12.30** Драма «Мой анёл-ахоўнік».
**14.30** Драма «Манглхорн».
**16.20** Камедыя «Сенсацыя».
**20.10** Фантастыка «Пасвячоныя».
**21.55** Драма «Пераправа-2».
**0.10** Драма «А вось і яна».
**1.50** Драма «Хоць раз у жыцці».
**3.35** Драма «Пах жанчыны».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Баявік «Мальтыйскі крыж».
**8.20** Баявік «Крыжаносец».
**10.20** Трагікамедыя «Анучны саюз».
**12.20** Камедыя «Каін XVIII».
**14.05** Драма «Поп».
**16.25** Драма «Мусульманін».
**18.25** Драма «Нашчадкі».
**20.20** Камедыя «Усё і адразу».
**22.20** Драма «Дурань».
**0.40** Меладрама «Прасвятленне».
**2.20** Меладрама «Мой тата — Барышнікаў».
**4.00** Баявік «Параграф 78».

### National Geographic

**6.00, 13.15** Гульні розуму.
**6.25, 21.00, 0.50, 4.00, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.45, 10.55, 14.45** Мегазаводы.
**8.35, 15.35, 22.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.20, 17.55** Антарктыка.
**10.10** Уварванне на Зямлю.
**11.40, 16.20, 19.30, 23.20, 2.25** Расследаванні авіякатастроф.
**12.25** Марс.
**18.40, 21.45, 1.40, 4.45** Космас: прастора і час.
**0.05, 3.10** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Зроблена з другаснай сыравіны.
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Мяцежны гараж.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Калекцыянеры аўто.
**19.00** Аўтальянцы.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.

■ Тэлесеткі

## БЛОГЕРЫ Ў ЦЯЛЬНЯШКАХ

**З 23 па 27 студзеня тэлеканал АНТ пакажа рэаліці-шоу «Блогеры па-флоцку», у якім расійскія і беларускія блогеры, вядомыя ў сеціве, адправіліся ў падарожжа па пяці морах на легендарным парусніку «Крузенштэрн», прычым не ў якасці пасажыраў, а нароўні з юнгамі-практыкантамі з марскіх вучылішчаў.**



У ліку ўдзельнікаў — блогер Дзмітрый Шылаў з Краснаярска, беларуская тэлевядучая Ганна Бонд, маскоўскі рэжысёр-пастаноўшчык Андрэй Афонін, журналіст-аглядальнік аўтамабільнай тэматыкі Алена Лісоўская, відэаблогер-вандроўнік Аляксандр Кандрашоў і іншыя — усяго 8 чалавек. Дарэчы, спачатку «марскіх ваўчанят» мусіла быць дзесяцёра. Што стала няўжо з двума, гледачы даведаюцца ўжо з першай серыі праекту.

За пяць серый тэлеверсіі, спецыяльна падрыхтаванай для беларускага тэлеканала, удзельнікі прайшлі «Курс юнгі»: вучыліся падымацца на мачты і вязаць марскія вузлы, праводзілі астранамічныя назіранні і выконвалі курсанцкую зарадку, вывучалі асновы навігацыі і радыёсувязь. Для пераможцы шоу яго арганізатар, сусветна вядомая кампанія Wargaming, падрыхтаваў каштоўны прыз — 1 мільён расійскіх рублёў.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

■

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Гэты тыдзень можа адкрыць перад вамі бліскучыя перспектывы, варта толькі быць уважлівымі і не ленавацца. У справах шукайце для сябе карысць, але не забывайце ўлічваць інтарэсы партнёраў. Дэвіз тыдня: «Рух наперад!» Інакш вас чакае застой і разлад з сабой, таму што праца або адносіны вам проста надакучаць. Тыдзень вельмі спрыяльны для рамантычнага фронту. Ёсць шанцы аднавіць старыя адносіны, наладзіць добры кантакт з блізкім чалавекам. Таксама ёсць высокая імавернасць здабыць другую палову для тых, хто цяпер адзінокі.



**СКАРПІЁН.** Удалы і спрыяльны час як для асабістага жыцця, так і для праяўлення сябе ў працы. Вас чакае поспех у любых справах, якія не супярэчаць вашым уласным жаданням, душэўнаму настрою і не выклікаюць дыскамфорт. Будзеце поўныя аптымізму, новых ідэй і планаў. Вы можаце ажыццявіць практычна ўсе задумы ў сферы бізнесу, заключайце неабходныя дагаворы і кантракты. Вас чакае прыбытак і прэмія. Змагайцеся, і вашы намаганні будуць узнагароджаны. У асабістым жыцці чакаюцца вельмі прыемныя падзеі і рамантычныя сустрэчы.



**СТРАЛЕЦ.** У пачатку тыдня ёсць магчымасць, што вашы планы ўвойдуць у супярэчнасць з планамі вашага начальства. Варта знайсці разумны кампраміс. На гэтым тыдні вы можаце разлічваць на грашовыя паступленні, як заслужаныя, так і ў форме падарунка. У чацвер і суботу не захапляйцеся паходамі па распродажах: можна купіць шмат непатрэбнага. У нядзелю не мучайце сябе хатнімі клопатамі — лепш знайдзіце час для адпачынку, паляжыце на канапе з кніжкай.



**КАЗЯРОГ.** Пажадана не адкладаць завяршэнне важных спраў і нарэшце прыняць канчатковае рашэнне ў прафесійнай сферы. Вам спатрэбіцца такая якасць, як камунікабельнасць, яна дапаможа дамагчыся поспеху. Спрыяльны перыяд для пабудовы новых адносін і паляпшэння старых. Паспрабуйце рэальна ацэньваць свае магчымасці і не засмучацца ў выпадку няўдачы, проста выпраўце дапушчаныя памылкі і промахі. Субота — удалы дзень, вы многае паспееце.



**ВАДАЛЕЙ.** Гэты тыдзень — час умацавання вашага аўтарытэту. Адчуеце нейкую сілу, якая дазволіць брацца за справы, што раней выклікалі няўпэўненасць, быць таварыскім і разняволеным у любой сітуацыі. У аўторак зможаце выпадкова выявіць раней утоеную, але вельмі важную для вас інфармацыю, якую можна і трэба выкарыстоўваць у сваіх мэтах. У пятніцу можаце здабыць доўгачаканы адказ на пытанне, якое даўно вас хвалюе.



**РЫБЫ.** На гэтым тыдні птушка поспеху можа прыляцець проста вам у рукі. Цяпер важна не спалохацца раптоўнай радасці і не пачаць залішне мітусіцца. У сярэдзіне тыдня паспрабуйце адмовіцца ад любых паездак і не пускаць у дом старонніх людзей. Важна пазбягаць перагрузак на працы, залішняя занятасць не толькі не пакіне часу, каб радавацца жыццю, але можа негатыўна адбіцца на здароўі. Выхадныя варта прысвяціць вырашэнню сямейных праблем, удзяліце ўвагу дзецям.

## Чацвер, 26 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10** Спецыяльны рэпартаж.
**9.30, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.10, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Ліст чакання».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.40** Дзень спорту.
**0.55 Серыял «Паляўнічыя на брыльянты».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.25 Серыял «Кухня».**
**10.10, 17.30 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.00, 18.20 Дэтэктыў «Сёмая руна».**
**12.00, 16.40 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.50, 21.25 Серыял «Шурачка».**
**13.20, 22.10** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
**14.20, 20.30** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 0.00** «Анлайн. Па-за сеткай». Скетчкам.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.05** «Як гартаваўся стайл-2». Сіткам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранакак».
**7.35** «Беларуская кухня». Фаршыраваны шчупак.
**8.05, 11.40, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.40 «Фурцава». Драма.**
**9.10, 15.25 «Полымя». Кінаповесць. Частка 2-я.**
**10.20** «Камертон». Народная артыстка Беларусі Святлана Акружная.
**10.45** «Гітара па крузе».
**11.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.25** «Музеі Беларусі». Музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок».
**12.55** «Край».
**13.20, 23.15** «Дыя@блог». Пра мову.
**13.45, 19.35 «Пастка». Драма.**
**14.30** «Славянскі базар у Віцебску-1992».
**16.35** «872 дні Ленінграда». «Смяротная тэрыторыя дзяцінства».
**17.15, 21.40 «Апошні бранепоезд». Серыял, заключныя серыі.**
**20.40** «Калыханка».
**21.05** «872 дні Ленінграда». «Цана перамогі».

### Беларусь 5

**8.00, 22.30** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Слэм-данк.
**8.40** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Індывідуальная гонка. Мужчыны.
**10.45** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Індывідуальная гонка. Жанчыны.
**12.50** Баскетбол. Еўракубак. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Нантэр» (Францыя).
**14.45** Жанчыны і спорт. Вольга Мазуронак.
**15.15** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 1/4 фіналу.
**16.55** Два бакі алімпійскага медаля. Дар'я Навумава.
**17.25** Баскетбол. Еўраліга. «Мілан» (Італія) — «Алімпіякас» (Грэцыя).
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Югра» (Ханты-Мансійск). У перапынку — Пра спорт. Навіны.
**21.55** Фактар сілы.
**22.40** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 1/2 фіналу.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Бесталковыя нататкі».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Грачанка».**
**23.05** Ян Карскі. Праведнік свету.
**0.30** «Блогеры па-флоцку».
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.35, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 0.15 «NEXT 3». Серыял.**
**12.25, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**5.10, 19.20 Серыял «Закон і парадак».**
**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Легальны допінг».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Дак. фільм «Сямейныя драмы».
**14.15** «Няма праблем!»
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**22.15 Маст. фільм «Спартак і Калашнікаў».**
**0.10 Маст. фільм «Танцуй, танцуй».**
**2.50 Серыял «Хто, калі не я?»**
**5.10** «Вой, мамачкі!»
**5.40** М/ф.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Васіліса».**
**19.10, 20.40 Серыял «Вы заказвалі забойства».**
**21.45, 23.10 Серыял «Склафасоўскі. Рэанімацыя».**
**23.55** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10 Серыял «Адвакат».**
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.40, 23.05** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Брацянікі».**
**12.05** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «За мяжой».
**14.15 Серыял «НС — Надзвычайная сітуацыя».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Чума».**
**21.25 Серыял «Адзін супраць усіх».**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Падарожжы Сіндбада».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00** Камедыя «Брыджыт Джонс».
**13.00 Серыял «Імперыя».**
**13.55 Меладрама «Праз увесь Сусвет».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** Мультпарад «Ліс і сабака».
**17.00** «Мой любімы гадаванец».
**17.30 Серыял «Людзі ў дрэвах».**
**18.20 Серыял «Падмані мяне».**
**19.05** «Фэшн is my прафэшн».
**19.25 Серыял «Здрада».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Трылер «Злачынца».**
**23.10 Серыял «Барыгі».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Тры каты».
**7.05** М/ф «Ёка».
**7.20** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**7.35** М/ф «Маша і мядзведзь».
**7.45** М/ф «Машыны казкі».
**7.50** М/ф «Фіксікі».
**8.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонішы».
**9.30** Меладрама «Ракавая красуня».
**11.30, 5.00** Серыял «Сакратар».
**12.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**13.30, 20.00** Серыял «Вы ўсе прыводзіце мяне ў шаленства».
**14.30** «Мільёны ў сетцы».
**15.00, 2.00** Серыял «Дзетка».
**16.00** Серыял «Мамачкі».
**17.00, 23.00** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Закрытая школа».
**21.00** Камедыя «Брыльянтавы сабака»
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**3.00** Серыял «Нанакаханне».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Калі мне будзе 54 гады». Маст. фільм.
**12.45** «Расія, любоў мая!» «Сямейны ачаг адыгаў».
**13.15, 23.50** «Следства вядуць знаткі». Тэлефільм.
**14.50** Колер часу. Надзя Рушава.
**15.10** «Чалавек, які выратаваў Луўр». Дак. серыял.
**16.05** «Абсалютны слых».
**16.50** «Астравы». Іван Рыжоў.
**17.35** Да 95-годдзя Маскоўскай філармоніі. Ірына Архіпава, Георг Отс, Марыс Ліепа, Мая Плісецкая ў Гала-канцэрце на фестывалі мастацтваў «Руская зіма». Запіс 1965 года.
**18.45** «Сяргей Боткін. Чалавек лёсу». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Культурная рэвалюцыя».
**22.00** «Сяргей Гармаш. Маналог у 4 частках».
**22.30** «Спіс Кісялёва. Выратаваныя з пекла». Дак. фільм.
**23.20** Колер часу. Малюнкі А.С. Пушкіна.
**23.45** Мастсавет.
**1.20** С. Пракоф'еў. Сімфонія №2.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Рэкламны бум па-савецку». 2006 год.
**7.00, 9.40, 11.00, 15.40, 17.45, 19.00, 20.35, 21.40, 23.00, 1.05, 3.40, 5.00, 5.40** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Чужыя лісты».
**8.50, 14.50, 20.00, 2.50** «Прэсэкспрэс». 1995 год.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.05** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» А. Шырвінт і М. Дзяржавін.
**12.00** «Сняем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.
**12.55** Фільм-спектакль «Прыйшоў мужчына да жанчыны». 1990 год.
**17.00** «Я сама». Тэма: «Я такая непрыгожая». 1995 год.
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага року». «Аквариум». Мы ніколі не станем старэйшымі». 2-я частка. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Дванаццатая ноч».
**23.35** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Яўген Еўтушэнка. Вершы розных гадоў.
**0.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгарадцавым: Дайджэст памяці А. Хвасценкі, А. Башлачова, В. Цоя. 2006 год.
**1.20** Тэлеспектакль. Оскар Уайльд «Як важна быць сур'ёзным». 1976 год.
**5.20** «Час пік» з Андрэм Разбашам.

### EuroSport 1

**3.30, 21.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.
**5.00, 14.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**5.30, 7.00, 9.35, 11.30, 15.30, 18.45, 1.05** Тэніс. Australian Open.
**11.15** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс»-экстра.
**14.30, 0.00** Тэніс. Матч дня. Выбар Матса Віландэра.

### Кінакамедыя

**0.50** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».
**2.40** Камедыя «Бамбу».
**4.30, 14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**5.10** Прыгоды «Фантамас раззлаваўся».
**6.55** Камедыя «Таксі».
**8.30** Камедыя «Таксі-2».
**10.05** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2».
**12.00** Камедыя «Найноўшы запавет».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Тата напракат» (3-я серыя).
**16.50** Камедыя «Тата напракат» (4-я серыя).
**17.50** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Бацька нявесты».
**19.30** Камедыя «Шалёныя выкладчыкі».
**21.05** Камедыя «Уніз па лесвіцы».
**22.45** Камедыя «Сутэнёр».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45, 14.50** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.10** «Доктар І...»
**8.35, 19.00, 2.45** «Асколкі». Серыял.
**10.05, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Сляпая».
**12.50** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**15.20** «Здзелка».
**15.50** «Натуральны адбор».
**16.5, 21.35** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.35, 1.55** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**22.55, 5.30** «Вокладка».
**23.25** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.10** «Фарсаж». Баявік.

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Камедыя «Шэф Адам Джонс».
**8.00** Трылер «Лофт».
**10.00** Трылер «Улада страху».
**12.10** Камедыя «Аднакласнікі».
**14.05** Фантастыка «Дывергент».
**16.35** Фантастыка «Ева: штучны розум».
**20.10** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**22.05** Трылер «Джо».
**0.10** Трылер «Каматознікі».
**2.15** Драма «Помні».
**4.05** Драма «Пераправа».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Браты Ч.»
**8.20** Драма «Край».
**10.30** Меладрама «Каханне напракат».
**12.30** Трагікамедыя «Нябёсы запаветныя».
**14.45** Меладрама «Сабака Паўлава».
**16.20** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
**18.30** Камедыя «Домік у сэрцы».
**20.20** Меладрама «Блаславіце жанчыну».
**22.30** Драма «Тата».
**0.25** Фільм жахаў «Мёртвыя дочкі».
**2.45** Баявік «Крыжаносец».
**4.35** Баявік «Мальтыйскі крыж».

### National Geographic

**6.00, 13.15** Гульні розуму.
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 11.00, 14.50** Мегазаводы.
**8.40, 15.35, 22.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.25, 17.55** Золата Юкана.
**10.10, 0.05, 3.10** Уварванне на Зямлю.
**11.45, 16.20, 19.25, 23.15, 0.50, 2.20, 4.00** Расследаванні авіякатастроф.
**12.30, 18.40, 21.45, 1.35, 4.45** Космас: прастора і час.

### Discovery

**8.00, 14.00, 19.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Зроблена з другаснай сыравіны.
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на складах.
**11.00** Разбуральнікі легенд.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Жыццё сабак.
**20.00** Смяротны ўлоў.
**1.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**2.00, 4.40** Маланкавыя катастрофы.

## Субота, 28 студзеня

### Беларусь 1

**6.10** Існасць.
**6.35, 21.40 Меладрама «Адразу пасля стварэння свету». 1—4-я серыі.**
**8.30** Буйным планам.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50 Серыял «Сваты-4».**
**10.55** «50 рэцэптаў першага».
**11.40** Спецыяльны рэпартаж.
**12.10** Гісторыі рамонту.
**12.45** Здароўе.
**13.30, 15.45 Меладрама «Замест яе». 1—4-я серыі.**
**15.15** Краіна.
**21.00** Панарама.
**1.25** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў».
**7.50 Фільм для дзяцей «Гензэль і Грэтэль».**
**8.50, 22.05** Тэлебарометр.
**8.55 Серыял «Шчаслівыя разам-4».**
**10.40 Анімацыйны фільм «Пячатка цара Саламона».**
**12.05** «Нядбайнікі». Пазнавальна-забаўляльнае шоу.
**13.15** «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**14.15** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** Капейка ў капейку.
**16.10 Меладрама «Маё вялікае грэцкае вяселле».**
**17.50** Рэпарцёр.
**18.40** «Бітва экстрасэнсаў. 14-ты сезон».
**20.40** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.
**23.20 Баявік «Кідок кобры-2».**

### Беларусь 3

**7.40** «Сіла веры».
**8.05** «Беларуская кухня». Грыбок.
**8.30, 12.50, 20.20** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.45 «Блізня». Камедыя.**
**10.35** «Край».
**11.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.35** «Я хачу гэта ўбачыць!» Браслаўскі раён.
**12.00** «Камертон». Пісьменнік Георгій Марчук.
**12.25** «Навукаманія».
**13.10** «Тэатр у дэталях». Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Безыменная зорка».
**13.35** «Подых струн».
**14.15** «Эти глаза напротив». Канцэрт песень Валерыя Абадзінскага.
**15.40 «Дрэнны добры чалавек». Драма.**
**17.15** «Знак лёсу». Дак. фільм.
**18.10 «Вазьму твой боль». Драма.**
**19.30** «Па хвалях нашай памяці». Эпоха фізікаў і лірыкаў.
**20.40** «Калыханка».
**21.05** «Апошні дзень». Віктар Цой.
**21.40 «Іголка». Драма.**
**23.00** IFMC. Віцебск. Балет Яўгена Панфілава. Спектакль «Яна».
**23.40** М/ф.

### Беларусь 5

**8.00, 22.30** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Спрынт. Мужчыны.
**9.40** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Спрынт. Жанчыны.
**11.25** Піт-стоп.
**11.55, 19.20** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Гонка пераследу. Мужчыны.
**12.50** Баскетбол. Еўраліга. ЦСКА (Расія) — «Эфес» (Турцыя).
**14.55, 20.05** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Гонка пераследу. Жанчыны.
**15.45** Жанчыны і спорт. Марыя Мамашук.
**16.15** Накаўт-раўнд.
**16.45** Авертайм. КХЛ.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Барыс» (Астана). У перапынках — Авертайм. КХЛ.
**20.55** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. 1/2 фіналу.
**22.40** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Матч за 3-е месца.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Спорт».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.15** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.05** Тэлечасопіс «Гумарынка».
**13.20** «Удача ў прыдачу! з «Еўраопт».
**14.05 Камедыя «Прыгоды Падзінгтана».**
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**18.00** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**19.00** Канцэрт Наташы Каралёвай.
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35** «Падмаскоўныя вечары».
**23.30 Маст. фільм «Абяцанне».**

### СТБ

**6.45 Маст. фільм «Дзівакі».**
**8.05** «Анфас».
**8.20 Меладрама «Вярніся да мяне».**
**10.20** «Рамонт па-сумленнаму».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «М і Ж».
**11.50** Дакументальны спецпраект: «Золата. Падман найвышэйшай пробы».
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Шчырая размова».
**13.55, 23.50 Камедыя «Марная мітусня».**
**15.30** «Далёкія сваякі».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.50** Дакументальны спецпраект: «Самыя жудасныя эпідэміі».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 «Участак лейтэнанта Качуры». Серыял.**

### МІР

**6.00, 1.25 Серыял «Легальны допінг».**
**7.10** М/ф.
**8.00** «Саюзнікі».
**8.25** «Я — валанцёр».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Медыцынская праўда».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Гараж».**
**12.40** «Любімыя акцёры».
**13.10** «Цяжар абеду».
**13.40 Маст. фільм «Грошы на дваіх».**
**16.15 Серыял «Ніна».**
**23.30 Маст. фільм «Знак лёсу».**
**5.40** М/ф.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**8.15 Дэтэктыў «Следства вядуць знаткі».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі».
**12.10** «Сямейны альбом».
**13.00** «Наша справа».
**13.15** «Пешшу...»
**14.15 Маст. фільм «Украдзі мяне».**
**17.25** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**22.40 Маст. фільм «Прыгавор ідэальнай пары».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00** Сёння.
**8.45** «Іх норавы».
**9.15** «Вуснамі дзіцяці».
**10.25** Галоўная дарога.
**11.10** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.10** Кватэрнае пытанне.
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.15** «Двайныя стандарты».
**15.10 Серыял «НС — Надзвычайная сітуацыя».**
**16.20** «Адноўчы...»
**17.05** «Сакрэт на мільён». Аляксандр Васільеў.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Ты не паверыш!»
**20.50 Маст. фільм «Цягнік на поўнач».**
**0.05** «Жывыя легенды».

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.05, 21.10, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.40 Баявік «На грэбні хвалі».**
**11.25 Камедыя «Фокус».**
**13.15 «Глядзім усёй сям'ёй». Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы».**
**14.30 «Глядзім усёй сям'ёй». Серыял «Аднойчы ў казцы».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак.
**16.30 Серыял «Айцец Браўн».**
**17.25, 19.10 Камедыя «Ідэальны муж».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Мюзікл «Рок на стагоддзі».**
**23.35** М/ф «Брэменскія музыканты».

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Мія і я».
**7.30** «Ералаш».
**8.30** М/ф «Тры каты».
**8.35** М/ф «Ёка».
**8.50** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**9.10** М/ф «Фіксікі».
**9.20** М/ф «Машыны казкі».
**9.25** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.30** М/ф «Аліса ведае, што рабіць».
**10.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!»
**10.30** Серыял «Татавы дочкі».
**11.30** Серыял «Гатэль «Элеон».
**13.30, 1.20** «Турбаміксер».
**15.30** Драма «Арол дзявятага легіёна».
**17.40** Анімацыйны фільм «Рэальная белка».
**19.20** Драма «Пампеі».
**21.20** «Уральскія пельмені».
**23.20** Фэнтэзі «Іншы свет-2: эвалюцыя».
**4.30** «Лаві момант».
**5.00** «Празорлівая».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Серафім Палубес і іншыя жыхары Зямлі». Маст. фільм.
**12.00** «Астравы». Радзівон Нахапетаў.
**12.45** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**13.15** «Жудасныя бацькі». Маст. фільм.
**15.00** Вера Васільева ў спектаклі Тэатра сатыры «Ракавая цяга». Пастаноўка А. Жыцінкіна.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** Да 85-годдзя з дня нараджэння Рымы Казаковай. «Лінія жыцця».
**18.25, 1.55** «Гісторыя моды». Дак. серыял.
**19.20** Да юбілею Людмілы Савельевай. «З вечара да паўдня». Маст. фільм.
**21.35** «Рамантыка раманса».
**22.35** Кіно на ўсе часы. «Краіна ценяў». Маст. фільм.
**0.40** Жак Лусье. Сольны канцэрт у Кёльне.
**1.30** «Дурная...» «Крыўда». М/ф для дарослых.
**2.50** «Харун-аль-Рашыд». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага року». «Акварыум». Мы ніколі не станем старэйшымі». 2-я частка. 2007 год.
**7.00, 8.35, 9.40, 11.00, 12.55, 14.45, 15.40, 17.00, 19.00, 3.40, 5.45** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Дванаццатая ноч».
**8.50** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.35** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Яўген Еўтушэнка. Вершы розных гадоў.
**12.00. 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1964. 2011 год.
**13.10** Маст. фільм «Рэспубліка ШКІД».
**16.00** «Колба часу».
**17.15** Канцэрт гурта «Машына времени». 1990 год.
**19.15** «КВЗ-87». НДУ — ДДУ.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Калі верыць Лапатухіну...»
**0.05** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.
**1.00** Фільм-спектакль «Прыйшоў мужчына да жанчыны». 1990 год.
**5.00** «Я сама». Тэма: «Я такая непрыгожая». 1995 год.

### EuroSport 1

**3.30, 20.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.
**5.00, 7.45, 9.15** Тэніс. Australian Open.
**8.45, 13.30, 2.15** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**11.15** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс»-экстра.
**11.30, 1.00** Тэніс. Australian Open. Жанчыны. Фінал.
**13.45** Тэніс. Australian Open. Мужчыны. Парны разрад. Фінал.
**16.00** Санны спорт. Чэмпіянат свету.
**17.30, 2.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**0.00** Зімовыя віды спорту.

### Кінакамедыя

**0.35** Меладрама «Чаго хочуць жанчыны?»
**2.45, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**3.10** Камедыя «Тата напракат (1-я серыя)».
**4.00** Камедыя «Тата напракат (2-я серыя)».
**5.00** Камедыя «Тата напракат (3-я серыя)».
**5.50** Камедыя «Тата напракат (4-я серыя)».
**6.50** Камедыя «Волга-Волга».
**8.45** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».
**10.35** Камедыя «Пятніца».
**12.10** Камедыя «Бамбу».
**14.00** Камедыя «Уніз па лесвіцы».
**16.00** Меладрама «Чаго хочуць жанчыны?»
**18.15** Меладрама «Каханне з першага погляду».
**19.50** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы-2».
**21.45** Камедыя «Два ў адным».
**23.25** Камедыя «Шалёныя вакладчыкі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.00** «Доказ віны».
**11.35, 1.10** «Небяспечная памылка». Серыял.
**14.55** «Лега. Фільм». Анімацыйны фільм.
**16.40** «Гучныя справы».
**17.45** «Дзевяностыя».
**18.40, 5.30** «10 самых».
**19.15** «Мінулым летам у Чулімску». Маст. фільм.
**21.10** «Расамаха. Бессмяротны». Фантастыка.
**23.45** «Звышнатуральнае». Серыял.
**4.10** «Не нарадзіся прыгожай».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Фантастыка «Пасвячоны».
**8.00** Драма «Інтэрв'ю з вампірам».
**10.15** Камедыя «Як займацца каханнем па-англійску».
**12.10** Драма «Куды прыводзяць мары».
**14.10** Драма «Пераправа-2».
**16.25** Драма «А вось і яна».
**20.10** Трылер «Нічога асабістага».
**22.25** Меладрама «Спадарыня пакаёўка».
**0.25** Драма «Ціхая гавань».
**2.30** Трылер «Улада страху».
**4.25** Трылер «Лофт».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Наша Russia. Яйкі лёсу».
**8.05** Драма «Іван».

**10.05** Баявік «Паляванне на піранню».
**12.20** Камедыя «Аршын Мал Алан».
**14.15** Драма «Дурань».
**16.35** Меладрама «Прасвятленне».
**18.25** Камедыя «Усё і адразу».
**20.20** Камедыя «Увесь гэты джэм».
**22.20** Камедыя «Пятніца».
**0.10** Драма «Радзіма».
**2.20** Драма «Браты Ч.»
**4.10** Драма «Край».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.25, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**6.45, 9.05, 11.25** Чалавек супраць YouTube.
**12.15, 14.50, 16.35, 18.20, 20.55** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.
**21.45, 0.05, 2.25, 4.00** Паранармальнае.
**23.20** Дзіўная Другая сусветная.

### Discovery

**8.00, 18.00** Космас навыварат.
**9.00** Паляўнічыя на склады.
**10.00** Ліквідатар.
**11.00, 23.00** У пошуках скарбаў.
**12.00** Зорнае выжыванне.
**13.00, 1.00** Аляска: сям'я з лесу.
**14.00, 22.00** Аляска: апошні рубеж.
**15.00** Апошнія жыхары Аляскі.
**16.00, 21.00** Інжынерныя праліки.
**18.00, 7.10** Калекцыянеры аўто.
**19.00, 0.00** Аўтальянцы.
**20.00** Мотарэстаўрацыя.
**2.00** Рачныя монстры.
**4.40** Мяцежны гараж.

## Zамор'е

### БАБУЛЯ ЎЗЯЛА, УНУК ВЯРНУЎ

**Амерыканец Уэб Джонсан вярнуў у бібліятэку Сан-Францыска кнігу, узятую 100 гадоў таму, паведамляе газета San Francisco Chronicle.**



Зборнік кароткіх апавяданняў Фрэнсіса Хопкінса Сміта «На 40 хвілін пазней» у 1917 годзе брала бабуля мужчыны Фібі Уэб. Ён знайшоў кнігу ў 1996 годзе і высветліў, што сваячка памерла за тыдзень да таго, як скончыўся тэрмін вяртання зборніка. Тады Джонсан не аднёс яго ў бібліятэку, таму што вырашыў, што праз столькі гадоў ён перайшоў у сям'ю. Бібліятэка не стала штрафаваць мужчыну за пратэрміноўку, таму што праводзіць адмысловую акцыю па вяртанні кніг, якія чытачы не вярнулі ў тэрмін.

У красавіку 2016 года жыхарка Новай Зеландыі вярнула кнігу ў бібліятэку горада Окленда, узятую ў 1948 годзе. Кіраўніцтва ўстановы даравала жанчыне доўг у 17 тысяч долараў ЗША.

### ПРАДАЕЦЦА СМОГ

**Прадпрымальнік з Пекіна выпусціў у продаж банкі, якія змяшчаюць смог кітайскай сталіцы, паведамляе South China Morning Post.**



Прадукт атрымаў назву Beijing Air («Паветра Пекіна») і прадаецца па чатыры долары за слоік. «Цяпер вы можаце ўзяць Пекін з сабой куды б ні паехалі. Кансервы зручныя для выкарыстання, кожная ўпакоўка змяшчае ўнікальную сумесь кіслароду, азоту і яшчэ сёе-тое», — гаворыцца на сайце, які рэкламуе спецыфічны тавар. Як растлумачыў аўтар бізнес-ідэі, яна прыйшла яму ў галаву пасля таго, як ён убачыў кітайцаў, якія купляюць банкі з чыстым паветрам. Паводле слоў прадпрымальніка, яго тавар карыстаецца папулярнасцю, ён прадае да ста слоікаў Beijing Air за дзень.

Раней паведамлялася, што ўлады Пекіна стварылі экалагічную паліцыю, якая заклікана змагацца са смогам. У абавязкі новай структуры ўвойдзе адсочванне выпадкаў несанкцыянаванага падпалу смецця, драўніны, а таксама іншых біяматэрыялаў. Акрамя таго, экалагічныя паліцэйскія будуць спыняць спробы прыгатаваць барбекю на адкрытым паветры. З'яўленне гэтага падраздзялення звязана з вельмі цяжкай сітуацыяй з забруджваннем паветра ў КНР.

### ЗНАЙШОЎ КВІТОК НА МІЛЬЁН

**Амерыканец знайшоў страчаны латарэйны білет, які выйграў мільён долараў, паведамляе агенцтва UPI.**



Жыхар штата Арэгон Джамэл Паніса адшукаў канверт з набытым у мінулым студзені білетам, калі разбіраў паперы ў офісе падчас снегападу. Ён успомніў, што па тэлевізары расказвалі аб буйным выйгрышы ў латарэю, за якім так ніхто і не прыйшоў. Ён праверыў сваю знаходку і выявіў, што стаў уладальнікам мільёна долараў. Для таго каб атрымаць выйгрыш, у яго заставаліся лічаныя дні. 17 студзеня гэтага года яго грошы былі б перададзены ў Фонд эканамічнага развіцця Арэгона.

**Іван КУПАРВАС.** hvir@zviazda.by




## ПАМІЖ ДВУХ АГНЁЎ...

Мой добры знаёмец Фёдар, наколькі ведаю, з дзяцінства марыў пра паляўнічага сабаку і сапраўдную стрэльбу. Але ж марыць — адно, а вось абзавесціся... Гэта ў Фёдара ну ніяк не выходзіла! Ажаніўся ўрэшце, асобна стаў гаспадарыць. Вось зараз, думаў, мара ўжо збудзецца, бо жонцы сваёй, з якой сябраваў са школы, пра паляванне Фёдар казаў. І Каця, як быццам, усё разумела, аднак...

Пасля вяселля нібы падмянілі дзеўку, прамовіла як адрэзала:

— Сабаку яшчэ куды ні ішло — заводзь, выхоўвай сабе паляўнічага: неяк пракормім. А вось пра стрэльбу — нават думаць забудзься, бо грошай на яе не дам. Трэба спачатку жытло ў парадак прывесці, абстаноўку памяняць... Хіба некалі потым, пры добрым дастатку...

Калі той дастатак будзе, Фёдар не ведаў і нават ведаць не мог, бо пры сённяшніх цэнах заробку яго хапала толькі на ежу ды розную драбязу, карацей — на штодзённыя патрэбы.

Але ж мара на тое і мара, каб ёй не здраджваць. Вось і Фёдар, нават з гэтых сціплых зарплат, штомесяц умудраўся нешта зацісныць. Ён патайнік завёў: у дупло старой асіны, з якой збіраўся вулей зрабіць, складваў прыхаваныя грошы.

І на сабачку такі разжыўся: у знаёмага паляўнічага сібірская лайка была — Фёдар шчанючка маленькага выпрасіў. Прыгажунчык ён яшчэ той: выліты Бім — з чорным вухам! А ўжо ж разумнік...

Не дзіва, што Каця яго таксама палюбіла, што песціла рознымі пачастункамі. Фёдар жа ў строгасці трымаў: змалку прывучаў да паляўнічай справы.

І, трэба сказаць, не без толку: праз нейкі час малы ўжо добра арыентаваўся — па паху мог лёгка адшукаць прыхаваныя рэчы. (Спатрэбіўся, праўда, час, каб навучыць яго не распатроньваць тыя знаходкі, а прыносіць цэлымі...) Але ж «працэс» ішоў, і гаспадар быў задаволены. Больш таго, з марай пра ўжо хуткае сапраўднае паляванне ён не раз выходзіў да паветкі, даставаў з дуплянкі пакет з грашыма — не раз пералічваў іх, пакуль...

У той дзень яго Кацярына прыбірала ў хаце і трэба ж — швабрай з-пад канапы выкаціла палку, з якой так любіў гуляцца сабака.

— Во куды загнаў, — засварылася гаспадыня на Біма, потым выйшла на ганак і шпурнула «цацку» ў бок паветкі.

А Бімка як быццам таго і чакаў: у тры скокі ён апынуўся на дрывотні.

Што далей было?

Цяжка сказаць: магчыма, сама палка адным канцом заляцела ў Федзеву хованку, магчыма, сабака павёўся на пах гаспадара, але ж усуну ён галаву ў дуплянку, схапіў зубамі... цэлафанавы скрутак і шчаслівы панёсся ў хату.

— Што гэта, Бімка? Аддай мне, — папрасіла Кацярына.

Бім пакорліва падаў ёй скрутак. Каця ўзяла, разгарнула і ахнула:

— Вось гэта знаходка! Малайчынка, Бім! А я толькі думала, дзе грошы ўзяць на шпалеры, на фарбу для падлогі.

...Кінуўшы мыць яе (і сапраўды сем гадоў нефарбаваную), жанчына тут жа рушыла ў краму, купіла ўсё, што трэба для рамонту, а вечарам, як толькі муж вярнуўся з працы, яшчэ і пахвалілася, які ў іх кемлівы сабака:

— Уяўляеш, — сказала, — пабег на дрывотню і адтуль...

Не даслухаў Федзя, што было далей: кінуўся да паветкі, засунуў руку ў дуплянку і аж сеў: грошай на месцы, вядома ж, не было.

— Эх ты, здраднік, — сказаў ён сабаку, які заўсёды трымаўся побач. — Здаў маю мару... Як пустую бутэльку здаў... Дурылка... Так мы з табой ніколі стрэльбу не купім, ніколі, як людзі, на паляванне не сходзім...

Бім уважліва слухаў яго, ва ўсе вочы глядзеў і думаў, як цяжка з гэтымі людзьмі! Ну ніякай жа логікі: за адзін і той жа скрутак гаспадыня, бач, па галоўцы пагладзіла, а гаспадар — бэсціць... Дык каго з іх слухаць, каму служыць?

Гэтае нялёгкае пытанне, вінавата падціснуўшы хвост, сабака панёс у свой закутак, каб потым абдумаць і, можа, знайсці адказ.

**М. Багданаў,**
*в. Новы Пагост, Мёрскі раён.*

## І ВОСЬ ЯНЫ ПРЫЕХАЛІ... І ПАЕХАЛІ

...Альтэрнатывы няма: людзі прыходзяць у гэты свет і, на вялізазны жаль, сыходзяць. А вось памяць пра іх застаецца.

У мяне, напрыклад, быў любімы стрыечны брат, пра жыццё якога можна расказваць гадзінамі. Адно імя чаго вартае: Ірыней! Гэтак назваў яго бацюшка ў далёкім 1938 годзе, назваў, відаць, паводле святцаў і думаць не думаў, што ў радыусе 30 кіламетраў хлопца (а потым і дзядзьку Рэніка) будуць знаць і малыя, і вялікія, будуць вельмі часта «скланяць», бо з ім вечна нешта здаралася...

У той час (як здаецца, і ў гэты) усе дарогі вялі ў Мінск. Я ў ім вучылася, мой родны брат Жэня — працаваў і тут жа, у сталіцы, ужо засяліўся ў новае жытло. Падзея!

Адзначыць яе, паглядзець на тую кватэру сабраліся і Рэнік з жонкай Тарэсай. Жэня, як гасцінны гаспадар, хацеў паказаць ім горад, некуды звадзіць, каб было што ўспомніць, каб было што расказаць...

І вось яны прыехалі, гасцююць: у адзін з вечароў мы збіраемся ў... рэстаран, Жэня выбраў «Патсдам». Значыць, ехаць нам трэба — хто ведае Мінск — з вуліцы Леаніда Бяды на вуліцу Леніна.

Метро тады яшчэ не працавала, таму па сённяшнім праспекце Незалежнасці мы паехалі на тралейбусе, на «двойцы».

Прыгода была яшчэ тая: гадзіна пік (людзі едуць з працы), салон перапоўнены, але ж тралейбус на прыпынках спыняецца, некага высаджвае, некага падбірае...

— Людцы мае, — куды ж вы лезеце? — пытае ў пасажыраў Рэнік. — Няўжо вам цяжка кіламетраў колькі пехатою прайсці? Я, каб ведаў, куды мяне вязуць, далібог бы з вамі не ціскаўся! У мяне ж на гэта жонка ёсць...

Ці не ўсю дарогу, карацей, ён уголас дзівіўся і разважаў, ці не ўсю дарогу не мог зразумець, чаму людзі на адным прыпынку заходзяць, а на другім — можна сказаць, адразу ж — выходзяць. Ну гультаі ж гарадскія! (Я, прабачце, не сказала, што Рэнік кожны дзень «адмотваў» пехатой кіламетраў з дваццаць: ён на Лідчыне ў двух калгасах абслугоўваў радыё і тэлефонную сувязь. — **Аўт.**)

Але ж з горам папалам мы даехалі да рэстарана. Хораша пасядзелі там, ну, вядома ж, выпілі, пагаварылі, — сабраліся дадому.

— Скажы мне, браце, колькі вёрст да тваёй хаты? — папытаўся Рэнік.

— Ну кіламетраў, можа, з пяць, — адказвае Жэня. — А можа, і болей.

— І што — з-за пяці кіламетраў я буду душыцца ў гэтых вашых тралейбусах? Ды нізавошта!.

Мы паспрабавалі было давесці яму, што тралейбусы ў дванаццаць ночы пустыя, што на іх нам будзе хутчэй і лягчэй, што жанчыны ў туфліках на высокіх абцасах, што ўсе стаміліся, але ж марна: Рэнік стаяў на сваім, і мы ў выніку рушылі пешкі.

Да плошчы Перамогі яшчэ неяк дашкандыбалі, потым — разуліся (ноч, балазе, была цёплая) і пайшлі ўжо босыя... Моўчкі... Адзін Рэнік на ўвесь праспект спяваў *«Ой, мароз, мароз, не марозь мяне»*.

Не памятаю, у колькі мы дабраліся да братавай кватэры. Памятаю: назаўтра ногі ў мяне балелі так, што праз залу перайсці не магла.

Але ж час марнаваць мы не сталі: па абедзе (і зноў такі пешкі) пайшлі ў парк Чалюскінцаў. Рэнік пакатаўся там на атракцыёнах — на «Халі-Галі», на «Супер 8»...

І, вярнуўшыся ў вёску, дамоў, усім людзям казаў, што Мінск — прыгожы, што вуліцы там шырокія і чыстыя, што ў рэстаранах кормяць добра, толькі каўбасу ды мяса рэжуць надта тоненька, таму на відэлец трэба чапляць па чатыры (сама меней па тры) скрылёчкі, каб потым было што жаваць.

Аднак галоўнае ўражанне, што ў сталіцы ніхто не ходзіць пяшком: людзі, як тыя дурні, плацяць грошы, стаяць на прыпынках, каб хоць трохі ды пад'ехаць...

З чаго Рэнік, дарэчы, досыць цікавую выснову зрабіў: трэба, каб усе пасажыры бралі даведкі, што менавіта на гэтым аўтобусе ці тралейбусе ім трэба ехаць на працу. Ва ўсе астатнія месцы хай дабіраюцца пехам. Глядзіш, меней на вуліцах транспарту — чысцейшае паветра.

І людзі, значыць, куды здаравейшыя і дабрэйшыя, бо ходзяць пехатой, бо па дарозе могуць нечым палюбавацца, пра нешта падумаць... У тым ліку — пра сваё ўласнае жыццё. Такое непрадказальнае і такое кароткае.

**Кацярына Будзіловіч,**
*г. Скідаль.*

## СВЯТЫ ВЕЧАР

Гэта здарылася акурат на Каляды. Мы з мужам прыйшлі з працы. Самы час, значыць, быў павячэраць, прычым не проста, а як на свята...

Злазіла я ў склеп, дастала адтуль слоік з дамашняй каўбаскай. Закінула яе ў каструлю, каб адварыць. Сама за гэты час усё іншае на стол сабрала. Здавалася б, можна садзіцца? Ад паху ажно слінкі цякуць...

Але што гэта? Быццам, шум на нашым двары? Песні пад вокнамі... Так і ёсць: нехта ў дзверы стукаецца...

Адчынілі, а гэта дзеці. І якія ж малайцы: прыбраліся па ўсіх правілах, ходзяць па вёсцы, людзей віншуюць...

Ну як жа ім не аддзячыць? Зняла я з пліты тую каўбаску, аддала калядоўшчыкам, няхай пачастуюцца гарачым.

А што ж нам з мужам? Мы ж паранейшаму галодныя.

Яшчэ раз спусцілася я ў склеп, дастала другі слоік з каўбасой, паставіла на пліту.

Яна хутка зварылася. А толькі стала здымаць — пад вокнамі зноўку песні, зноўку стукае ў дзверы. Адчыняем — на парозе новыя калядоўшчыкі, цяпер ужо дарослыя. Таксама песню спяваюць, таксама віншуюць нас... Ды ў гэтакі вечар...

Іх, карацей, мы таксама пачаставалі.

І толькі пасля гэтага — хоць з трэцяй спробы — але ж павячэралі самі.

Елі, дарэчы, са спехам, бо згаладаліся, і са смехам, бо міжволі слухалі: ці не гамоніць хто на вуліцы, ці не ідуць да нас новыя калядоўшчыкі?

**Людміла Пашкевіч,**
*Полацкі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў



# СІНДРОМ ПЕРАЙМАННЯ

## Прытрымайце дзверы таму, хто ідзе следам

ГЭТАГА рыжага... ды не, не рыжага — аранжава-сонечнага коціка я прыкмеціла ў пераходзе каля нашай станцыі метро яшчэ на мінулым тыдні, калі ціснулі моцныя маразы. Цікаўная маленькая пыска выглядвала з цёплага шаліка, у якім трымала яго гаспадыня разам з надпісам на кавалку кардону «Аддам у добрыя рукі». Людзі натоўпам спяшаліся міма, да тралейбусаў і аўтобусаў, якія развозілі іх па цёплых кватэрах, кацяня ніхто не забіраў, дзяўчына стаяла з ім кожны вечар.

Я кожны раз імкнулася спыніцца, але заклапочаны натоўп нёс далей, і кожны раз было працей паддацца яго мэтанакіраванаму руху, не супраціўляючыся. Толькі ўжо апынуўшыся ў тралейбусе, думала, што вось тая дзяўчына стаяла там апошні раз, а заўтра яна проста выпусціць жывёлку на вуліцу, і маленькая жывая істота, так і не зразумеўшы, за што з ёй так, загіне на марозе. І я штовечар давала сабе слова: калі заўтра ўбачу дзяўчо ў пераходзе, я абавязкова забяру ў яе пушысты аранжавы камячок, схаваю яго пад футра, прыгарну да сябе, прывязу дахаты, абагрэю і накармлю. Прыйшоўшы дадому, я кожны вечар дамаўлялася з гаспадыняй кватэры Клавай. «Заўтра прывязу табе сябра», — казала ёй. Клава незадаволена муркала і кусала за палец, што на кацінай мове, напэўна, азначала: «Не вельмі і хацелася, але што зробіш, давай ужо, прывозь»... Але назаўтра ўпарты натоўп нёс да выхаду з перахода, і вырвацца з яго, збочыць ну ніяк не атрымлівалася.

А ўчора я ўсё-ткі спынілася. Каб паназіраць, як ужо амаль мой кот знайшоў сабе новую гаспадыню. Гэта дзяўчынка-падлетак з віяланчэллю за плячыма не стала адкладаць добрую справу на заўтра. Яна таксама ішла з метро разам з маці, як і сотні іншых людзей. Але ўбачыла бліскучыя даверлівыя вочкі, што бліскалі з-пад цёплага шаліка, надпіс пра «добрыя рукі» — і ў адно імгненне, не азіраючыся ні на кога, вырашыла, што гэтыя рукі — менавіта яе. Яна беражліва ўладкоўвала жывёлку за пазуху, маці ёй дапамагала, а побач стаяла чалавек пяць цёткак-разявак (у тым ліку і ваша пакорная слуга), усім сваім выглядам паказваючы намер і гатоўнасць забраць кацяня сабе...

А на прыпынку пад халодным вільготным сіверам дзівакаватага выгляду хлопец іграў на баяне. Іграў не вельмі ўмела, спрабаваў скласці папуры з музыкі старых кінафільмаў. Задубелыя пальцы траплялі не на тыя клавішы, атрымлівалася гэткая рыпучая какафонія, з якой толькі зрэдку выразна чуваць была знаёмая мелодыя. Хлопец раз-пораз сумна пазіраў на зусім пусты пачак з-пад печыва, у якім ляжала некалькі самых дробных манет. Ніхто яму нічога ў той пачак не кідаў, усе толькі глядзелі са шкадаваннем, адводзілі вочы і з імпэтам кідаліся да свайго транспарту, які падрульваў да прыпынку. Гэткая супольнасць спачувальна-абыякавых людзей.

Жанчына, якая падышла да небаракі-баяніста, была не з той «тусоўкі». Яна ўсміхнулася і кінула ў пачак два рублі. Хлопец здзіўлена прыўзняўся, зазірнуў у пачак і радасна, на ўвесь прыпынак, перакрычаўшы свой баян, на якім не пераставаў рыпець, крыкнуў: «Дзякуй!» Многія (калі не ўсе), хто быў на прыпынку, пачулі і азірнуліся. Зразумеўшы, у чым справа, людзі палезлі даставаць кашалькі. Манеты ў пачак сыпаліся са звонам. Ашалелы ад шчасця хлопец не паспяваў дзякаваць. Так мы і ўціскаліся ў аўтобус — пад яго радаснае «дзякуй!» ды пад да адурэння фальшывае выкананне мелодыі пра Аляксандру з фільма «Масква слязам не верыць»...

ГЭТА хвароба, пэўна, сучаснага вялікага горада — калі добрыя і чулыя па сутнасці сваёй людзі, якія, калі б апынуліся сам-насам з сітуацыяй, дзе камусьці патрэбна дапамога, ніколі б не прайшлі міма, у натоўпе, сярод гэткіх самых людзей, сваёй дабрыні і чуласці... саромеюцца, ці што? А можа, спрацоўвае прынцып калектыўнай адказнасці: чаму менавіта я павінен? Хай іншыя, вунь вакол колькі людзей! Калі ж хтосьці асмеліцца сказаць найперш самому сабе «я — павінен!», спачувальна-абыякавая супольнасць раптам распадаецца на дзясяткі індывідуумаў, у якіх, аказваецца, ёсць і жаданне, і магчымасці дапамагаць. Чалавек, якому стане на вуліцы дрэнна, можа праляжаць там даволі доўгі час, і мінакі не будуць спыняцца каля яго, кіруючыся прынцыпам асабістай неспрычыненасці: «Можа, п'яны?.. А чаму я?.. Вунь колькі людзей ходзіць, не прападзе»... Можна знайсці яшчэ дзясятак ну вельмі пераканаўчых аргументаў і пайсці далей па сваіх справах, удыхнуўшы з палёгкай, калі праблема знікне з вачэй. А вось калі хтосьці спыніцца і нахіліцца над небаракам — за лічаныя хвіліны збіраецца цэлы натоўп. Усе наперабой спрабуюць дапамагчы: выклікаюць «хуткую», дастаюць з кішэняў валідол, даюць вельмі патрэбныя парады. Ну проста каманда герояў-выратавальнікаў, такіх неабыякавых, такіх спагадлівых, гатовых заўсёды і ўсюды прыйсці на дапамогу бліжняму.

Але сапраўдны герой ва ўсіх падобных сітуацыях толькі адзін — той, хто першы не прайшоў міма. Не азіраючыся, не сумняваючыся, кіруючыся найперш уласным сумленнем. Астатнія ж спыняюцца толькі з-за сіндрому пераймання («чым я горшы?»). Што не перашкаджае пасля хваліцца сваякам: «Сёння чалавеку дрэнна стала, ратавалі», або: «Там сабачка бяздомны так жаласліва скуголіў, я б узяў, але нейкая маладзіца апярэдзіла». І не хочам прызнацца хоць бы самі сабе, што, калі б не тая маладзіца, скуголіў бы бяздомны сабачка на тым жа месцы і цяпер...

КАЛІСЬЦІ старэйшы калега напісаў такое сваё назіранне. Калі ў метро цяжкія дзверы, якія матляюцца туды-сюды ад скразняку, зляваць і прытрымаць для таго, хто ідзе ўслед за табой, гэты чалавек, як бы ён ні спяшаўся, заўсёды прытрымае іх для таго, хто ідзе следам. Учора паэксперыментавала. Сапраўды — працуе. Сіндром пераймання ў дзеянні!

Пачаць станавіцца тым, хто ты, па сутнасці, і ёсць на самай справе, — добрым і чулым, нават на людзях зусім не боязна — проста прытрымаць дзверы перад тым, хто ідзе ўслед.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■

## ■ І так бывае...

# ВЫКРАЎ ІНШАМАРКУ, КАБ ПОТЫМ ПРАДАЦЬ У РАСІЮ

**У сталіцы затрыманы жыхар Оршы, які ўкраў аўтамабіль Toyota Land Cruiser, што належыць аднаму з буйных банкаў краіны.**

За названым аўтамабілем быў замацаваны кіроўца банка, якому кіраўніцтва дазволіла паркаваць машыну ў двары свайго дома. У чарговы раз вечарам мужчына прыехаў з працы і пакінуў яе каля пад'езда. Выйшаўшы раніцай на вуліцу, кіроўца не знайшоў службовы аўтамабіль, пасля чаго паведаміў у міліцыю.

Паводле інфармацыі Фрунзенскага РУУС г. Мінска, іншамарку выкраў жыхар Оршы, які меў намер у далейшым прадаць яе ў Расію. Аўтамабіль быў знойдзены ў гаражы суседа зламысніка. На машыне былі ўстаноўлены рэгістрацыйныя знакі ўзору Расійскай Федэрацыі. Пасля праверкі дзяржнумароў высветлілася, што яны былі прысвоены аналагічнаму аўтамабілю ў Расіі, які ўжо даўно зняты з уліку транспартных сродкаў. Таксама высветлілася, што сусед не ведаў, што гэтая іншамарка знаходзіцца ў вышуку. Кошт аўтамашыны быў ацэнены ў 67 тысяч рублёў. Затрыманаму пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да 12 гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | 1 | 2 |
|---|---|---|
| **Адрес земельного участка** | д. Кузевичи, кадастровый номер земельного участка 623284502101000059 | д. Родевичи, ул. Школьная, У-21Б, кадастровый №623280810601000072 |
| **Площадь земельного участка** | 0,2343 | 0,1798 |
| **Наименование инженерных сетей** | Подъездные пути удовлетворительные | Подъездные пути удовлетворительные |
| **Начальная цена (бел. руб.)** | 5000,00 | 2653,20 |
| **Задаток (бел.руб.)** | 1000,00 | 530,77 |
| **Расходы по изготовлению документации** | 71,40 | 1435,73 |

**Аукцион проводится 24.02.2017 в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района, Минской области, здание Гайненского исполнительного комитета. Документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, до 21 февраля 2017года (последний день подачи документов 20 февраля 2017г. до 17-00)по адресу д. Логоза, ул. Центральная д. 2 Логойского района, Минской области.**

Задаток перечисляется на р/с № 3600619021108 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 795, ОКПО 04431493, УНН 600573220, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

**Контактные телефоны: 801774-56436, 56498**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский шпалопропиточный завод» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **станка долбежного ГД-320 (инв. № по бух. учету 041196) 2006 г.в., суммарная мощность электродвигателя 13,32 кВт, размер 2850×2160×3010, масса 5660 кг. Находится в нерабочем состоянии (долбяк демонтирован, требует замены или кап. ремонта).**

**Начальная цена с НДС (20%) – 25 314,90 бел. руб.** Задаток 10% от начальной цены – 2 531,00 бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **23.02.2017** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.02.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

УНП 600012389

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**22 февраля 2017 г. проводит открытый аукцион с условиями № 02-У-17 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на трех земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, ул. Уборевича – ул.Ташкентская – МКАД | 0,59 | Для строительства объекта «Объект общественного питания быстрого обслуживания с линией автораздачи по ул. Уборевича – ул. Ташкентская – МКАД» | 209 717,22 | 32 000 | 9 224,53 | Снос зданий и сооружений открытой парковки по ул. Уборевича, 93 | 102 900,00 |
| 2 | г. Минск, ул. Машиностроителей – МКАД (9 км) | 1,4228 | Для строительства объекта «Многофункциональный комплекс с паркингом по ул. Машиностроителей – МКАД (9 км)» (состав объекта: торговый комплекс – 5000 кв. м, административный – 5000 кв. м, встроенный паркинг, производство – 10 000 кв. м) | 408 491,96 | 60 000 | 11 684,03 | Снос зданий и сооружений по просп. Партизанскому, 160А. Демонтаж внутриплощадочного водопровода диаметром 100 мм, частичный демонтаж сетей ливневой канализации | 200 810,24 |
| 3 | г. Минск в районе ул. Ваупшасова – МКАД (4 км) | 1,6426 | Для строительства объекта «Объект придорожного сервиса (гостиница, кафе, торговля) в районе ул. Ваупшасова – МКАД (4 км)» | 575 101,85 | 80 000 | 11 743,94 | Снос зданий и сооружений по ул. Карвата, 100 | 1 166 718,16 |

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.
Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.
Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).
Аукцион состоится **22 февраля 2017 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.
**Для участия в аукционе необходимо:**
**внести задаток не позднее 16 февраля 2017 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;
**представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:**
заявление на участие в аукционе;
документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;
подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;
**дополнительно представляется:**
индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.
При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.
**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №6, с 23 января 2016 г. по 16 февраля 2017 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**
Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона* в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:
- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
